Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

4 ЖНІЎНЯ 2007 г.
СУБОТА

№ 145 (26010)

Кошт 380 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

СВЯТА НА ПРАСПЕКЦЕ «ЗВЯЗДЫ»

Учора да некаторых сваіх чытачоў газета прыйшла не толькі ў традыцыйным сваім выглядзе, але і ў выглядзе салодкіх пачастункаў і памятных сувеніраў.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Журналісты газеты ўручалі іх асабіста некаторым з падпісчыкаў, якія жывуць альбо знаходзяцца на праспекце імя газеты. Гэта былі і навучальныя ўстановы, і арганізацыі, і сем'і. Знаёмства аказалася надзвычай прыемным. Яшчэ раз мы ўпэўніліся, якая ў «Звязды» цудоўная аўдыторыя, якія інтэлігентныя, душэўныя і сімпатычныя людзі яе чытаюць. На жаль (і на шчасце!) немагчыма прыйсці з тортам да кожнага чытача і асабіста з ім пазнаёміцца, паразмаўляць. Але хай гэта сустрэча стане сімвалічным выказваннем нашай падзякі ўсім, для каго сёння выходзіць газета! Фотарэпартаж з акцыі «Звязды» на праспекце ўласнага імя чытайце ў нумары за 9 жніўня.

Аляксандр Лукашэнка:

«Практыка перадачы прыватнікам стратных сельгасарганізацый сябе апраўдала»

Гэты факт канстатаваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 3 жніўня ў час рабочай паездкі ў Мінскую вобласць.

Знаёмячыся з ходам уборачных работ на Міншчыне, кіраўнік дзяржавы наведаў філіял сельскагаспадарчага комплексу ЗАТ «Вітэкс», паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

ЗАТ «Вітэкс» — буйнейшае прадпрыемства ў Беларусі па вытворчасці касметычнай прадукцыі пад гандлёвымі маркамі «Беліта-Вітэкс». У 2004 годзе ў адпаведнасці з указам Прэзідэнта, што прадугледжваў продаж юрыдычным асобам стратных сельгасарганізацый, ЗАТ «Вітэкс» набыло СВК «Цеплень» Уздзенскага раёна, на базе якога быў створаны філіял СГК «Вітэкс». На момант перадачы паказчыкі работы СВК «Цеплень» сярод гаспадарак у раёне былі найгоршымі.

Як было даложана Прэзідэнту, у гэтым годзе комплекс упэўнена займае адно з вядучых месцаў у раёне па многіх вытворча-эканамічных паказчыках. Сярэдняя заработная плата работнікаў — Br501 тыс., заробак спецыялістаў-жывёлаводаў дасягае Br600—700 тыс.

Паводле ацэнкі Прэзідэнта, філіял сельскагаспадарчага комплексу ЗАТ «Вітэкс» — адзін з наглядных прыкладаў рэзультатыўнасці палітыкі перадачы прыватнікам нерэнтабельных сельскагаспадарчых арганізацый. Як падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, у Беларусі каля чвэрці стратных сельгаспрадпрыемстваў было перададзена прадпрымальнікам. Большасць з іх сёння дэманструюць добрыя вынікі.

«Прыватнікі ў гэтым плане нас не падвялі. Нездарма мы чвэрць нашых разбураных сельгаспрадпрыемстваў аддалі прадпрымальнікам. Вынік ёсць. Вось і рэформа: прыватнік эфектыўна працуе на зямлі, не трэба дзяліць адсталыя калгасы на каваркі і аддаваць фермерам, і ніякай алергіі гэта ў народа не выклікае», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Звяртаючыся да суправаджаючых службовых асобаў, Прэзідэнт адзначыў: «Чыноўнікам трэба мець на ўвазе: як і абяцалі, трэба аказаць прыярытэтную падтрымку, у тым ліку і ў асноўнай вытворчасці, у пытаннях, не звязаных з сельскай гаспадаркай, тым, хто ўзяў стратныя сельгаспрадпрыемствы і дабіўся высокіх паказчыкаў».

Беларускі лідар паразмаўляў з камбайнерамі і пацікавіўся іх думкай аб якасных характарыстыках айчыннай тэхнікі. Паводле водгукаў механізатараў, новыя беларускія камбайны даюць магчымасць пазбегнуць істотных страт збожжа пры палегласцях.

Прэзідэнт таксама наведаў сучасны зернесушыльны комплекс, які працуе на мясцовых відах паліва. У рэспубліцы цяпер ужо каля 46 працэнтаў зернесушылак сыродняй і малой магутнасці працуюць на мясцовым паліве.

Аляксандр Лукашэнка агледзеў айчыннае і імпартнае абсталяванне па плюшчэнню зерня. Паводле слоў спецыялістаў, прадэманстраваная беларуская плюшчылка-ўпакоўшчык зерня мае шэраг пераваг перад замежнымі аналагамі, у тым ліку за кошт больш нізкай цаны.

Прэзідэнт у цэлым пазітыўна ацаніў ход уборачнай кампаніі ў Беларусі. Азнаёміўшыся з інфармацыяй аб тэмпах уборкі ў Мінскай вобласці і краіне ў цэлым, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Калі так далей пойдзе — са збожжам у нас будзе добра».

На сёння ў рэспубліцы ўбраны дзве трэці плошчы збожжавых. Як было даложана кіраўніку дзяржавы, у Мінскай вобласці ўборку плануецца завяршыць на працягу бліжэйшых 10 дзён. Паводле слоў губернатара рэгіёна Леаніда Крупца, цяпер праходзіць перакідка сельгастэхнікі з паўднёвых раёнаў вобласці ў паўночныя.

Прэзідэнт адзначыў неабходнасць павелічэння вытворчасці кукурузнага зерня ў рэспубліцы. «Тыя, хто гавораць, што больш выгадна закупляць кукурузу за мяжой, зусім не маюць рацыі», — лічыць беларускі лідар.

На думку Аляксандра Лукашэнкі, Беларусь павінна больш актыўна пастаўляць малочную прадукцыю ў Еўропу. «У Еўропе сёння недастатковa малака. Цэны на малочныя прадукты падскочылі на 50 працэнтаў. Таму трэба больш актыўна ўстанаўліваць канкрэтныя сувязі з еўрапейскімі прадпрыемствамі, — сказаў Прэзідэнт. — Трэба ісці на рынкі Еўропы. Яны гатовы заплаціць добрыя грошы за гэту прадукцыю».

Кіраўнік дзяржавы ўказаў на неабходнасць якаснай і своечасовай падрыхтоўкі глебы да сяўбы азімых.

Толькі за чатыры апошнія гады ўведзена ў эксплуатацыю: 6 наплаўных аўтадарожных мастоў, 5 пешаходных мастоў, звыш 20 км пад'язных чыгуначных пуцей, рэканструявана каля 12 км трамвайных пуцей, праложана 110 км ліній сувязі...

Са святам!

А. ТРАФІМЕНКА, намеснік начальніка дэпартамента па ідэалагічнай рабоце — начальнік аддзела ідэалагічнай работы Дэпартамента транспартнага забеспячэння Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь.

Праз горад Васілевічы цягнікі спяшаюцца на Хойнікі, Калінкавічы, Рэчыцу і Гомель. Таварныя і пасажырскія — 25 цягнікоў за дзень. Няма выхадных у чыгуначнай станцыі — жыццё тут толькі па дакладнаму графіку. Рытм, аператыўнасць і своечасовасць руху лакаматываў у пэўнай ступені залежыць ад станцыйных дзяжурных — іх прафесіяналізму. Больш за 10 гадоў працуе дзяжурным чыгуначнай станцыі «Васілевічы» Сяргей ГРАБЦЭВІЧ.

СА СВЯТАМ, ЧЫНУНАЧНІКІ!

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У ЧЫГУНАЧНЫХ ВОЙСКАХ СЛУЖЫЎ НАВАТ КУПАЛА...

Гісторыя чыгуначных войскаў бярэ пачатак з будаўніцтва першых чыгунак у Расіі. Паралельна з развіццём чыгунак ствараюцца чыгуначныя батальёны. Адзін з першых такіх батальёнаў дыслацыраваўся на тэрыторыі Беларусі ў г. Баранавічы са жніўня 1876 года. З яго і пачынаецца гісторыя чыгуначных войскаў у Беларусі.

Адметна, што ў чыгуначных войсках у 1916—1917 гадах праходзіў воінскую службу вялікі беларускі паэт Янка Купала.

У перыяд з 1926 па 1940 год чыгуначнымі часцямі на тэрыторыі рэспублікі былі пабудаваны чыгуначныя лініі Орша—Лепель, Гомель—Чарнігаў, Рослаў—Магілёў—Асіповічы. Воіны-чыгуначнікі самаддана і стойка змагаліся пры абароне горада-героя Мінска і Гомеля, Оршы і Смаленска.

Часці 30-й асобнай чыгуначнай брыгады з 1965 года на тэрыторыі Беларусі ўдзельнічалі ў будаўніцтве другіх пуцей чыгуначных участкаў Гомель—Жлобін—Асіповічы, Калінкавічы—Оўруч, Гомель—Церахоўка, Лунінец—Ракітнае, пабудавалі сотні кіламетраў пад'язных пуцей да прамысловых прадпрыемстваў і аб'ектаў народнай гаспадаркі рэспублікі.

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 07145>

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 4.08.2007 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 145,00
1 еўра	2 938,01
1 латвійскі лат	4 217,05
1 літоўскі літ	850,90
1 чэшская крона	104,82
1 польскі злоты	776,54
1 расійскі рубель	83,94
1 украінская грыўня	423,23

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	25,5554
10 UAH	50,7928
1000 BYR	11,8897
EUR	35,0262

Курс у гандлёвых кампаніях (на 3.08.2007 г.)

USD	2140 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У БОГІНА ЗА ПАЗУХАЙ

Браслаўская вёска Богіна — гэта не толькі край азёраў і буслоў. У недалёкай будучыні паселішча можа стаць турыстычнай Меккай. І не без падстаў. Для вясковага турызму тут аднаўляюцца старыя будынкі і ўзводзяцца новыя сядзібы. Пра адну з такіх сядзіб чытайце сёння на 4-й старонцы.

РАЗЛІКІ ЗА РАСІЙСКІ ГАЗ У БЛІЖЭЙШЫ ЧАС БУДУЦЬ АЖЫЦЦЁЎЛЕНЫ Ў ПОЎНЫМ АБ'ЁМЕ

Аб гэтым заявіў першы намеснік міністра энергетыкі Беларусі Эдуард Таўпянец у Мінску, адказваючы на пытанні журналістаў.

Ён адзначыў, што Беларусь перавяла першы плацеж «Газпраму» ў памеры $190 млн. У бліжэйшы час часткамі будуць ажыццёўлены астатнія плацяжы.

Каментуючы сітуацыю з пастаўкамі газу, Эдуард Таўпянец нагадаў, што ў гэтым годзе Беларусь атрымлівае газ па цане $100 за 1 тыс. куб.м, што больш як у два разы вышэй, чым у мінулым годзе.

Кіраўніцтва Расійскай Федэрацыі раней заяўляла, што для стабілізацыі разлікаў за газ Беларусі будзе выдзелены крэдыт у памеры $1,5—2 млрд. У адпаведнасці з кантрактам, рэспубліка ў першым паўгоддзі аплачвала 55 працэнтаў кошту паставак расійскага газу, а для аплаты астатніх 45, зразумела, разлічвала на атрыманне гэтага тэхнічнага крэдыту.

Эдуард Таўпянец праінфармаваў, што ўжо ў чэрвені Міністэрства энергетыкі Беларусі і «Белтрангаз» неаднаразова праводзілі перагаворы з ААТ «Газпрам» па аплаце запазычанасці за пастаўкі газу ў Беларусь у першым паўгоддзі. 19 ліпеня была ўжо практычна дасягнута дамоўленасць аб тым, што «Газпрам» прадаставіць Беларусі адтэрміноўку да 1 лістапада. Прадугледжвалася «пад 5,94 працэнта гадавых адтэрмінаваць гэту запазычанасць», — сказаў Эдуард Таўпянец. Аднак «Газпрам» паставіў умову для прадастаўлення адтэрміноўкі — падзел дзеючага кантракта з Беларуссю на пастаўку і транзіт газу на 3 асобныя кантракты. З гэтым беларускі бок не мог згадзіцца, таму што адзіны кантракт з'яўляецца неад'емнай часткай пратакола аб стварэнні сумеснага беларуска-расійскага газатранспартнага СП і падзел кантракта падрывае прававую базу стварэння сумеснага прадпрыемства, падкрэсліў Эдуард Таўпянец.

Паводле яго слоў, у «Газпрама» была магчымасць прадаставіць Беларусі адтэрміноўку плацяжоў да 1 лістапада, аднак расійская кампанія выставіла ультыматыўныя патрабаванні разлічыцца за газ на працягу трох дзён, інакш пастаўкі газу ў Беларусь будуць абмежаваны на 45 працэнтаў. «Такія дзеянні расійскага боку не зусім зразумелыя», — сказаў Эдуард Таўпянец. У адпаведнасці з дагаворам аб стварэнні СП, спрэчкі, што ўзнікаюць паміж бакамі, павінны вырашацца на працягу 45 дзён шляхам перагавораў. «Газпрам» з'яўляецца акцыянерам беларуска-расійскага прадпрыемства і, згодна статуту СП, не павінен прымаць дзеянні, накіраваныя на пагаршэнне эканамічнага стану сумеснага газатранспартнага прадпрыемства. Абмежаванне паставак у Беларусь пагоршыла б эканамічны стан «Белтрансгазу», сказаў першы намеснік міністра.

Эдуард Таўпянец адзначыў, што Беларуссю прынята рашэнне, няхай і цяжкае для рэспублікі, не чакаючы расійскага крэдыту, пагасіць запазычанасць за першае паўгоддзе. Стопрацэнтна будуць аплачвацца і бягучыя пастаўкі газу ў рэспубліку.

Беларусь была гатова і да абмежавання, адзначыў Эдуард Таўпянец і выказаў упэўненасць, што ў любой сітуацыі эканоміка краіны і насельніцтва не адчулі б рэзкіх збояў у выпадку абмежавання паставак. У энергасістэме Беларусі ёсць запасы рэзервовага паліва.

«Беларусь бездакорна выконвала ў першым паўгоддзі ўмовы кантракта з ААТ «Газпрам», — заявіў першы намеснік міністра энергетыкі. — Больш таго, за гэты час мы прапампавалі транзітам праз тэрыторыю Беларусі ў трэція краіны на 5,6 працэнта больш, чым плануавалася ААТ «Газпрам». Гэта паўтара мільярда кубаметраў, і мы іх забяспечылі».

Беларусь не выключае магчымасці выкарыстання ў перспектыве ўкраінскіх газасховішчаў, паведаміў Эдуард Таўпянец.

Цяпер вядзецца запампоўванне газу ў беларускія газасховішчы — паступіць больш як 600 млн куб.м. Гэтыя запасы выкарыстоўваюцца, як правіла, толькі ў зімовы час у перыяд марозаў, каб згладжваць нераўнамернасць спажывання газу.

Эдуард Таўпянец паведаміў, што цяпер у суткі ў рэспубліцы спажываецца каля 45 млн куб.м газу, у тым ліку насельніцтвам — 1,4-1,5 млн куб.м. Ён падкрэсліў, што ў энергетыцы ёсць рэзервовыя віды паліва, і галіна гатова забяспечыць у любых сітуацыях стабільнае забеспячэнне насельніцтва і эканомікі краіны.

БЕЛТА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У ВЫНІКУ АВІЯЎДАРУ ПА АФГАНІСТАНУ ЗАГІНУЛІ СОТНІ ЧАЛАВЕК

Больш як 200 чалавек загінулі ў пятніцу ў выніку амерыканскай авіябамбардзіроўкі афганскага горада Мазары-Дзіні ў паўднёвай правінцыі Гільменд, перадае агенцтва АР. Мэтай бамбардзіроўкі былі баевікі руху «Талібан», аднак, як паведамілі афганскія чыноўнікі, у выніку бамбардзіроўкі загінулі не толькі баевікі, але і вялікая колькасць мірных жыхароў.

Паводле звестак тэлеканала Al-Jazeera, ударам з паветра разбурана мячэць, дзе сабраліся на малітву мірныя жыхары. Як лічыць тэлеканал, акцыя мела на мэце аказаць ціск на кіраўніцтва «Талібана», якое ўтрымлівае ў палоне 21 паўднёвакарэйскага заложніка. Між тым, амерыканскае ваеннае камандаванне ў Афганістане сцвярджае, што ў выніку авіяналёту загінулі толькі баевікі.

Раней у пятніцу памочнік дзяржсакратара ЗША Рычард Баўчэр заявіў, што ЗША могуць скарыстаць сілу для вызвалення заложнікаў. «Мы спадзяёмся, што ціск будзе эфектыўным, наша мэта — вызваліць гэтых людзей жывымі і здаровымі», — заявіў Баўчэр. Дыпламат адмовіўся паведаміць, аб якіх мерах ціску можа ісці гаворка, аднак заявіў, што яны ўключаць магчымасць выкарыстання ваеннай сілы.

УГА ЧАВЕС ПАТРАБУЕ АД ДЖОРДЖА БУША ВЫВЕСЦІ ВОЙСКІ З ІРАКА

Прэзідэнт Венесуэлы Уга Чавес патрабуе ад Джорджа Буша прыслухацца да голасу народаў свету і вывесці войскі з Ірака. «Кожны дзень у гэтай краіне гінуць дзеці, жанчыны, цэлыя сем'і. Пара спыніць генацыд», — заявіў ён, выступаючы ўчора ў Каракасе.

У. Чавес звярнуўся да народаў свету праз ААН з заклікам прыняць неадкладныя меры для таго, каб амерыканскія войскі былі выведзены з Ірака. «Неабходна прама сказаць кіраўніцтву ЗША, што кожны народ мае права на жыццё», сказаў ён. Прэзідэнт заявіў, што ў сувязі з прадаўжэннем вайны ў Іраку і нападкамі ЗША на Венесуэлу ён выключае магчымасць дыялогу з Дж. Бушам. Паводле яго слоў, «адносіны з ЗША не могуць палепшыцца, бо прэзідэнт гэтай краіны, страціўшы палітычны розум, адчувае толькі нянавісць да Венесуэлы». Разам з тым ён выказаў спадзяванне на дыялог з новай адміністрацыяй ЗША пасля прэзідэнцкіх выбараў. Аб гэтым паведаміла агенцтва ІТАР—ТАСС.

КАРЦІНА ВАН ГОГА АКАЗАЛАСЯ ПАДРОБКАЙ

Карціна, якую прыпісвалі вялікаму Ван Гогу (яна доўгія гады належала Нацыянальнай галерэі «Вікторыя» ў Мельбурне, Аўстраліі), аказалася падробкай. Амаль 80 гадоў яе лічылі шэдэўрам постімпрэсіянізму, а першыя сумненні ў сапраўднасці ўзніклі толькі летась.

Палатно, якое атрымала назву «Галава мужчыны», знаходзіцца ў калекцыі аўстралійскай галерэі з 1940 года, паведамляе Reuters. Да гэтага яно ўваходзіла ў збор карцін вядомага газетнага магната Кейта Мердака. Карціна, як належачая пэндзлю Ван Гога, ацэньвалася ў 25 мільёнаў долараў. Мастацтвазнаўцы з Амстэрдама, якія праводзілі экспертызу, хоць і прызналі ў палатне фальшыўку, усё ж пацвердзілі яго храналагічную аўтэнтычнасць: карціна сапраўды была напісана пры жыцці вялікага мастака-постімпрэсіяніста, у другой палове XIX стагоддзя.

БРЫТАНЦАЎ ПРОСЯЦЬ МЕНШ ПІЦЬ ЗА МЯЖОЙ

Міністэрства замежных спраў Вялікабрытаніі рэкамендавала сваім грамадзянам, якія выязджаюць на адпачынак за мяжу, ведаць меру пры ўжыванні спіртнога, таму што гэта прыводзіць да арыштаў і іншых непрыемнасцяў. Такая рэкамендацыя ўтрымліваецца ў дакладзе брытанскага знешнепалітычнага ведамства пад назвай «Паводзіны брытанцаў за мяжой».

За апошні год брытанскіх турыстаў найчасцей арыштоўвалі ў Іспаніі і ЗША — 1549 і 1368 чалавек адпаведна. У дакументе адзначаецца, што прычынай арыштаў найчасцей з'яўляюцца хуліганскія выхадкі, выкліканыя злоўжываннем алкаголю. «Ведайце вашу норму і старайцеся піць не больш таго, што вы звычайна прывыклі піць дома», — рэкамендуе МЗС Англіі сваім суайчыннікам, якія выязджаюць за мяжу.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

НА НАСТУПНЫМ ТЫДНІ Ў БЕЛАРУСІ БУДЗЕ ПЕРАВАЖНА БЕЗ АПАДКАЎ

У суботу, 4 жніўня, тэмпература паветра ноччу будзе ад 9 да 15 градусаў цяпла, удзень паветра прагрэецца да 19-25 градусаў вышэй за нуль. Прыкладна такі ж тэмпературны фон захаваецца і ў нядзелю, 5 жніўня. Аб гэтым паведаміла карэспандэнту БЕЛТА начальнік аддзела метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Людміла Парашчук.

У пачатку наступнага тыдня будзе пераважаць поле павышанага ціску ад антыцыклону над Цэнтральнай Еўропай. Таму чакаецца ў асноўным без ападкаў, толькі ў панядзелак, 6 жніўня, на паўночным усходзе Магілёўскай і Віцебскай абласцей пройдуць невялікія дажджы, а 7—9 жніўня яны магчымы ў паўднёвых і паўднёва-ўсходніх раёнах.

Тэмпература паветра пачне паступова павышацца. І да сярэдзіны тыдня ўначы яна складзе 11—17 градусаў цяпла, а ўдзень павысіцца да плюс 23—28 градусаў.

БРЭСЦКІЯ БУДАЎНІКІ ЕДУЦЬ У ВЕНЕСУЭЛУ

Брэсцкі будтрэст № 8 атрымаў права дэлегаваць спецыялістаў на работу ў Венесуэлу.

Як паведаміў карэспандэнту БЕЛТА намеснік генеральнага дырэктара ААТ «Будтрэст № 8» Ігар Сільчанка, брэсцкія будаўнікі будуць курыраваць узвядзенне жылля ў венесуэльскай сталіцы горадзе Каракас. У рамках папярэдняй дамоўленасці размова ідзе аб 10 тыс. кв.м жылой плошчы. Гэта будуць пяціпавярховыя дамы маналітнага выканання. У Венесуэлу будуць накіраваны інжынерна-тэхнічныя кадры.

Паводле слоў Ігара Сільчанкі, ужо да канца гэтага года 20 брэсцкіх спецыялістаў могуць выехаць у Венесуэлу. Цяпер арганізавана першая група ў складзе каля 10 чалавек, якія пачалі вывучаць іспанскую мову.

Вольга КАБЯК, БЕЛТА.

МАГЧЫМЫЯ САПЕРНІКІ — «СЦЯЎА» І «ЗАГЛЕМБЕ»

Паводле выніку ўчарашняй жараб'ёўкі 3-га кваліфікацыйнага раўнда Лігі чэмпіёнаў, далейшым сапернікам пераможцы пары БАТЭ (Беларусь) — «Хабнарф'ёрдзюр» (Ісландыя) стане мацнейшая каманда сустрэчы «Заглембе» (Польшча) — «Сцяўа» (Румынія).

Пакуль фаварытамі гульняў лічацца БАТЭ (барысаўчане выйгралі ў першым матчы другога кваліфікацыйнага раўнда на выездзе з лікам 3:1) і «Сцяўа» (у гасцях каманда святкавала перамогу — 1:0). Сустрэчы 3-га кваліфікацыйнага раўнда запланаваны на 14—15 жніўня і 28—29 жніўня. Калі падначаленыя Ігара Крышэнкі выйдуць у гэту стадыю, беларусы першы матч правядуць дома.

Ірына ПРЫМАК.

НА ЧЫГУНЦЫ З'ЯВІЛІСЯ «СНАЙПЕРЫ»

І не толькі яны, але яшчэ і (як бы гэта лепш мовіць) падрыўнікі ці што. І гэта не жарт карэспандэнта, аб чым сведчаць наступныя факты.

Начальнік інспекцыі па справах непаўналетніх Гомельскага аддзела ўнутраных спраў на транспарце Анатоль Цалка паведамляе, што ў час руху прыгараднага цягніка па маршруту Гомель—Клёнкі нехта «абстраляў» камянямі трэці вагон, у выніку чаго было разбіта шкло ў адным з вокнаў. У другім выпадку недалёка ад станцыі Гомель-Паўночны стрэлачны перавод № 11 аказаўся заклееным, з-за таго, што нехта ўцісnуў у зазор камень.

Прыклады падобнага роду можна працягваць. З пачатку года ў Гомельскім рэгіёне іх зафіксавана ўжо сорак, і ў 21 выпадку ўдалося ўстанавіць асобы зламыснікаў. Гэта непаўналетнія шкоднікі, якія ці то не разумеюць, ці то не хочуць разумець, да якіх сумных вынікаў могуць прывесці іхнія гульні ў «партызанаў» і які маральны ўрон наносяць яны дзяржаве. Тут трэба нагадаць, што ў падобных выпадках правапарушальнікі, якія дасягнулі чатырнаццацігадовага ўзросту, прыцягваюцца да адміністрацыйнай адказнасці, а старэйшага ўзросту — да крымінальнай. У іншых выпадках урон чыгункі кампенсуюць бацькі непаўналетніх правапарушальнікаў.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

КАНАЛ ПАСТАЎКІ НАРКОТЫКАЎ ПЕРАКРЫТЫ

Ён скокнуў з акна сваёй кватэры, што на другім паверсе дома па вуліцы Чкалава ў Гомелі, з надзеяй уцячы ад міліцыі. Але гэта 37-гадоваму мужыку, які спецыялізаваўся на дастаўцы наркатычнага дурману з-за мяжы, не ўдалося. Ён не падазраваў, што за яго злачыннымі дзеяннямі сачылі, бо ўжо раней была ўзбуджана крымінальная справа і на яе падставе была атрымана санкцыя пракуратуры на вобыск у кватэры падазронага.

Падчас яго знойдзены 44 таблеткі псіхатропнага ўздзеяння экстазі, раслінная маса цёмнага колеру (як выявілася пасля, гэта была марыхуана накшталт «галандскіх шышак» — назва народная) і 50 таблетак жоўтага колеру, якія адпраўлены ў Мінск на экспертызу.

Як паведаміў нам кіраўнік прэс-цэнтра УУС Гомельскага аблвыканкама Ігар Грышкевіч, ёсць меркаванне, што затрыманы з'яўляўся галоўным у наркатычным «ланцужку» адпаведнай кампаніі дзялкоў. Трое з іх арыштаваныя раней. На сваіх «аперацыях» кожны з іх атрымліваў двайны навар.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ЗАТРЫМАНА ГАНДЛЯРКА «ЖЫВЫМ ТАВАРАМ»

Днямі ў Нацыянальнае цэнтральнае бюро Інтэрпола ў Рэспубліцы Беларусь паступіла інфармацыя ад украінскіх калег аб затрыманні ў Кіеве 29-гадовай грамадзянкі Беларусі.

Маладая жанчына знаходзілася ў міжнародным вышуку з чэрвеня 2007 года за ўдзел у злачыннай арганізацыі і гандлі людзьмі пры абцяжарваючых абставінах. Паводле даных упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС Беларусі, затрыманая мела дачыненне да вярбоўкі і арганізацыі вывазу за мяжу больш за 400 дзяўчат, 130 з якіх былі непаўналетнімі.

Агульны даход членаў злачыннай групы ад такога гандлю склаў каля паўмільёна амерыканскіх долараў.

Іна АРЭХАВА.

БЕЛПРОМСТРОЙБАНК

ОАО «БПС-Банк» устанавливает с 6 августа 2007 г. следующие процентные ставки по вновь привлекаемым и действующим депозитам физических лиц в белорусских рублях:

1. Срочный банковский депозит с автоматическим переоформлением

Срок привлечения	Минимальная сумма (рублей)	Процентная ставка (годовых)
1 месяц	50 000	8

2. Срочный банковский депозит с капитализацией

Срок привлечения	Минимальная сумма (рублей)	Процентная ставка (годовых)
6 месяцев	50 000	12

3. Срочный банковский депозит

Срок привлечения	Минимальная сумма (рублей)	Процентная ставка (годовых)
3 месяца	50 000	11
6 месяцев	50 000	12
9 месяцев	50 000	12

4. Срочный банковский депозит «Надежный»

Срок привлечения	Минимальная сумма (рублей)	Процентная ставка (годовых)
1 год	100 000	13

5. Срочный банковский депозит «Успешный»

Срок привлечения	Минимальная сумма (рублей)	Максимальная сумма (рублей)	Процентная ставка (годовых)
2 года	150 000	30 000 000	13

6. Срочный банковский депозит «Успешный-Плюс»

Срок привлечения	Минимальная сумма (рублей)	Максимальная сумма (рублей)	Процентная ставка (годовых)
2 года	500 000	100 000 000	14,5

Дополнительную информацию можно получить в любом учреждении открытого акционерного общества «Белпромстройбанк» или по телефону в Минске 289-46-06.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 11.07.2007 года на осуществление банковской деятельности.

Возврат средств физических лиц в ОАО «БПС-Банк» гарантируется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Звязда–90: адваротны адлік

Да юбілею «Звязды» засталося 5 дзён

З НАГОДЫ

З павагай і даверам

Уладзімір ПАНЦЯЛЕЕЎ, скульптар, старшыня Гродзенскай абласной арганізацыі Беларускага саюза мастакоў:

— «Звязду» я ведаю яшчэ з дзяцінства, паколькі яе чытаў наш бацька. Пасябраваў з газетай і я. Заўсёды з павагай і даверам стаўлюся да гэтага старэйшага беларускага выдання, да, без перабольшання, такой з'явы ў гісторыі нашай краіны, як «Звязда».

Безумоўна, што на жыццёвым шляху газеты было шмат цяжкасцяў, ды і сёння, пэўна, не без праблем. Але «Звязда» не страціла свой твар, захавала адметны стыль. І асабліва важна, на мой погляд, тое, што яна імкнецца выхоўваць у сваіх чытачоў павагу да нашых каранёў, традыцый, беларускай мовы.

Асабіста мне прыемна, што «Звязда» падтрымала ідэю ўпрыгожыць Гродна паркавымі скульптурамі. Першую, Жана Эмануэля Жылібера, могуць ужо ўбачыць гродзенцы і госці нашага горада. Напярадзе, спадзяюся, новыя скульптуры ў гэтым жанры.

Шчыра віншую калектыў рэдакцыі і чытачоў «Звязды» з юбілеем. Будзем разам!

Рэчы, людзі, памяць...

Напярэдадні 90-гадовага юбілею ў газеты «Звязда» з'явіўся ўласны музей. Першымі яго наведвальнікамі сталі... самі журналісты.

Адно з рэдакцыйных памяшканняў напоўнілася рэчамі, што звязаны з важнымі датамі і падзеямі ў гісторыі газеты. Частка пакою імітуе працоўны стол рэдактара — вялікі пісьмовы стол, старая друкавальная машынка, у якую нават запраўлены аркуш паперы — здаецца, сядай і пачынай пісаць артыкул. Тут жа — падшыўка «Звязды», але не сучасная, а таксама гістарычная, якой амаль 60 гадоў. Уздоўж сцяны — два аксамітныя сцягі, якімі ў свой час былі адзначаны выданні «Звязда» і «Чырвоная Змена». Асобнае пачэснае месца займае макет хаты Марфы Мігун з вострава Зыслаў у Любанскім раёне, дзе падчас Вялікай Айчыннай вайны выходзілі абедзве газеты.

Насупраць — наадварот, «куток сучаснасці»: ганаровыя граматы і дыпломы, фірменныя «звяздоўскія» прызы і падарункі, атрыманыя рэдакцыяй ад верных чытачоў і калег на ранейшыя круглыя даты, кнігі і альбомы, выдадзеныя нашымі былымі і цяперашнімі супрацоўнікамі. Знайшлося месца ў музеі, напрыклад, драўлянай скульптуры, якую «Звяздзе» падарыў некалі аднайменны саўгас з Гродзеншчыны, і сувенірам на марскую тэматыку, перададзеным газеце балтыйскімі маракамі... З розных крыніц — архіваў, газетных публікацый, афіцыйных дакументаў — склалі сваю факталагічную падборку пра лёс «Звязды» школьнікі. Гэты стос матэрыялаў таксама заняў месца ў музеі. Ці будуць праводзіцца ў ім адкрытыя экскурсіі? Цалкам магчыма...

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Студэнцкія білеты ўручаны ў БДУ пераможцам міжнародных прадметных алімпіяд сярод школьнікаў

Першыя студэнцкія білеты ўручаны ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Іх уладальнікамі сталі пераможцы міжнародных прадметных алімпіяд сярод школьнікаў. Уручаючы гэтыя дакументы першакурснікам, рэктар БДУ прафесар Васіль Стражаў адзначыў, што такая цырымонія праходзіць у ВНУ ўпершыню, але абавязкова стане традыцыйнай.

Студэнцкія білеты факультэтаў прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, фізікі і радыёфізікі і электронікі БДУ былі ўручаны пераможцам міжнародных матэматычнай і фізічнай алімпіяд. Тры шчасліўцы — Арцём Міцкевіч («золата»), Яўген Жыбрык («серабро») і Вадзім Слюсараў («бронза») — выпускнікі гэтага года сталічнай школы № 41. Яшчэ адным прызёрам («бронза») і ўладальнікам студэнцкага білета стаў Станіслаў Шапавалаў — выпускнік гімназіі № 1 г. Ліда. Вызначыліся таксама нашы школьнікі і на міжнароднай алімпіядзе па фізіцы, якая прайшла ў Тэгеране. Выпускнікі гэтага года Андрэй Маліноўскі (сталічная СШ 51, «бронза») і Віталь Ляўчук (гімназія № 5 г. Баранавічы, «бронза») таксама сталі сёння студэнтамі першага курса БДУ.

Рэктар расказаў, што больш за 60 працэнтаў усіх пераможцаў рэспубліканскіх і міжнародных алімпіяд гэтага года вырашылі прадоўжыць сваю адукацыю менавіта ў БДУ. Толькі ў гэтым годзе права на залічэнне ў вядучую ВНУ краіны без экзаменаў заслужылі сваімі перамогамі на рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах 136 таленавітых юнакоў і дзяўчат.

БЕЛТА.

ПРАДПРЫМАЛЬНІКАЎ — БОЛЬШ ЗА 200 ТЫСЯЧ ЧАЛАВЕК

Як паведамілі рэдакцыі ў прэс-службе Міністэрства эканомікі Беларусі, па стану на 1 ліпеня ў краіне зарэгістравана 200,4 тысячы індывідуальных прадпрымальнікаў.

Адзначаецца, што з пачатку года колькасць прадпрымальнікаў павялічылася на 8,6 тысячы чалавек. Зараз сума падатковых адлічэнняў з боку індывідуальных прадпрымальнікаў склала 340,5 млрд рублёў.

Сяргей ПАЛІНІН.

У МІНСКУ ПРАЦУЕ БОЛЬШ ЧЫМ МІЛЬЁН

Па выніках першай паловы года колькасць грамадзян, занятых у эканоміцы сталіцы, выйшла на рэкордны ўзровень — 1 млн 9,6 тыс. чалавек. Пры гэтым, як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, чакаецца, што да пачатку студзеня колькасць эканамічна актыўнага насельніцтва ў Мінску павялічыцца яшчэ прынамсі на 7,4 тысячы.

Адначасова ў чэрвені ў эканоміцы Гомельскай вобласці было занята 638 тыс., Мінскай вобласці — 636,8 тыс., Брэсцкай — 603,4 тыс., Віцебскай — 546,4 тыс., Магілёўскай — 487,3 тыс., Гродзенскай — 482 тыс. чалавек. Пры гэтым, паводле слоў прэс-сакратара міністэрства Галіны Трафіменка, зараз практычна ўсе рэгіёны краіны ўжо выйшлі на гадавыя планы па колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва. Зусім няшмат не «дацягнулі» да гэтага толькі Гомельшчына і сталіца.

Сяргей ГРЫБ.

Простыя рэчы

Тэрміновую я служыў пад Мінскам. Але нам, мотастралкам, у час вучэнняў даводзілася шмат вандраваць і па Беларусі, і па Расіі, з палігона на палігон. І вось заначавалі ў полі каля расійскай вёскі на ўсходзе Смаленшчыны. Раніцою даведаліся, што выступаем толькі па абедзе, вырашылі схадзіць у вёску па цыгарэты, ды і так паглядзець. Сярэдзіна сямідзесятых, я яшчэ ні разу не бачыў расійскай глыбінкі. Таму ўражанняў было шмат. Але два моманты помняцца да гэтага часу. Падышлі да крамы па цыгарэты. А там ужо ладная купка людзей, у асноўным жанчыны з бідончыкамі. Спачатку не звярнуў на гэта ўвагі. А потым з размоў у краме, зразумеў, што гэта людзі чакаюць, калі прывязуць малако! У вёсцы, дзе кругом у дастатку пашы, дзе стаяць някошаныя лугі — з бідончыкам ісці ў краму па малако... І яшчэ адно ўражанне: ішлі па вёсцы і каля хат не ўбачылі ніводнага гародніка. Добра, калі выкашана трава. А то і проста бур'ян падступае да прызбы. Пазней знайшоў у Аркадзя Смоліча, які апісваў беларускую вёску пачатку XX стагоддзя: «Каля хаты ж звычайна бывае садок, стаяць пчолы. Сад і дзядзінец з усіх бакоў абгароджваюць плотам; гэтым беларуская вёска моцна адрозніваецца ад маскоўскае».

Агародчык, у нас на Віцебшчыне гавораць «гародчык», садок — гэта агароджаны кавалачак зямлі (звычайна пад вокнамі), дзе садзяць кветкі, сеюць расаду. Ёсць яшчэ адна назва — кветнік.

Зразумела, што слова гэта паходзіць ад «агарод» — участак зямлі, засаджаны гароднінай. Тут ужо чалавек займаецца справай, якая дапаможа яму ў будучым, гэты кавалак зямлі, агарод, пракорміць, дазволіць стварыць запас на зіму. Усё, што расце на градах (грады, агарод — словы аднаго кораня) называюць зелянінай. Праца на градах таму — гаспадарчая. У Коласа:

Марына бабку падмяняе
І рэжа скібіны-брускі
Ды градку гладзіць і раўняе,
Як агароднік запраўскі.

У Дзеружынскага:

Ой, урадзіла
Ў агародзе рэпа.
А мне, маладой,
Капаць яе трэба.

А вось агародчык-садок з'явіўся ля сялянскай хаты ўжо для душы, каб было прыгажэй, каб цешылася вока, калі ў летнюю пару выйдзеш на дварышча і падыдзеш да гародчыка-кветніка. Ды ў нашай цяперашняй аддаленай вёсцы гародчык-кветнік сустрэнеш не перад кожнай хатай. Там, дзе жывуць старыя людзі, ім ужо цяжкавата заняцца гэтым. Але душа цягнецца. Бывае, едзеш праз вёсачку. А вось і жылая хата. Бачна не толькі таму, што не зарасла яшчэ сцежка да дзвярэй. Перад хатай, у вялікім некалі гародчыку, ускапана хоць бы градка, а на ёй высаджана пару дзесяткаў кветак. Відаць, перамагла нейкая бабуля свае хваробы і пастаралася, наколькі змагла, паклапаціцца аб прыгажосці.

Ну а ў буйнейшых вёсках, у мястэчках гародчыкі такой вось, жніveньскай парой буяюць кветкамі самых розных колераў. Адарваўся ад артыкула, выйшаў у матчын гародчык, яшчэ раз уважліва паглядзець на кветнік. У маці ён невялікі, недзе на трэць соткі. Так, а што ж тут цяпер цвіце? Браткі, вяргіні, флёксы, гваздзікі , цыніі, астры, пітуніі, сальвініі...

Але гэта не так і багата. Сустракаюцца гародчыкі-садкі, дзе дзесяткі відаў кветак. Успомнілася, што гадоў з пятнаццаць таму давялося пабываць у Мосары (у «Звяздзе» быў артыкул). Пробашч мясцовага касцёла Булька ўжо тады быў вядомы далёка за межамі сваёй парафіі. У трох сферах не непасрэдна касцельнай дзейнасці быў ён апантаны. Па-першае, змагаўся з п'янствам і вельмі паспяхова. Па-другое, на могілках у сваёй парафіі, ды і ў іншых таксама паспяхова агітаваў за зняцце агароджаў з магіл, упарадкаванне дарожак, устанаўленне капліц. І патрэціе, разводзіў кветнікі. З гордасцю паказваў іх мне. Тут расло больш за тысячу розных відаў кветак і дэкаратыўных раслін. Знаёмыя, якія былі ля касцёла нядаўна, казалі, што іх стала яшчэ больш. Увогуле, тэрыторыя ля касцёла стала месцам паломніцтва людзей нават індыферэнтных да рэлігіі.

Трэба сказаць, што і ў маіх родных Паставах за апошнія гады значна паболела гародчыкаў, кветнікаў. Не толькі на цэнтральнай плошчы, паабапал галоўных вуліц, але і на ўскрайках горада, ля прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў.

Пры ўмелым падборы кветак у гародчыку, сваім цвіценнем яны будуць радаваць вока ад вясны і да восені. Праўда, ёсць два перыяды, калі гародчыкі пяражываюць не зусім спакойныя часы. Гэта дні перад апошнімі званкамі ў школах і дні перад пачаткам заняткаў у іх. Цяпер жа і ў Паставах кветкі можна купіць шмат дзе, але аматараў палаташыць чужы гародчык хапае.

І тут успомніўся мне даўні выпадак, з васьмідзесятых гадоў. У свой час на нашым канцы вуліцы жыло шмат хлопцаў. Нягледзячы на пэўны разрыў ва ўзросце — сябравалі, разам ваявалі супраць іншых вуліц, разам потым хадзілі на танцы, а потым параз'ехаліся хто куды. Ды толькі ў летнюю пару, час водпускаў, абавязкова збіраліся. І вось сядзім ля вогнішча на нашай палянцы над рэчкай, успамінаем, спяваем. Час позні, а разыходзіцца неяк і не хочацца. Вось толькі праблема — нечага не хапае для падтрымання размовы, таго, з чым нядаўна аб'яўлена барацьба. Нідзе не купіш, ды ў той час начных крам і не было. А ад паляны да рэдакцыі, дзе я працую, метраў дзвесце. А там у мяне ў стале ляжыць пару бутэлечак. Праўда, ключы я пакінуў якраз на стале. Ды залезу ў свой кабінет і праз акно, ведаю як. Цёмна, ніхто і не заўважыць. Так і зрабіў, падышоў да акна, адчыніў фортку, праз яе адкрыў акно. Забраў патрэбнае — і назад. І ўсё забылася. Але праз нейкі час сустракаю ў горадзе знаёмага маладога міліцыянера, той паціснуў руку.

— Ну, прывітанне, начны злодзей.
— Не разумею.
— А хто ў вокны па начах залазіць?
— Ты адкуль ведаеш?

І расказаў ён:

— Насупраць твайго акна ў рэдакцыі гародчык. Дзяўчыну з той хаты ведаеш. Вось мы з ёй у гародчыку на лавачцы і заседзеліся дапазна. Шэпчам пра сваё. Чую — нехта ідзе. І да акна рэдакцыі. Кошкаецца, адчыняе. Залез. Ну, думаю, злодзей мой і прэмія за яго мая. А як стаў ты вылазіць, пазнаў я, што гэта ты. Ды яшчэ з бутэлькамі. Не стаў я сябе выдаваць.

І такі вось погляд з гародчыка. Трэба сказаць, што пасядзець у гародчыках на лавачках у добрае надвор'е любяць многія пенсіянеры. З-за кустоў бэзу, высокіх яргінь іх нябачна, а пенсіянерам бачна і чутно ўсё. Немалое ім задавальненне. Бэз. Цяпер яго ў гародчыках садзяць менш — зацяняе. А раней жа ідзеш па мястачковай вуліцы. І шпалерамі з двух бакоў ён буяе рознымі колерамі, напаўняе, асабліва пасля дажджу, паветра непаўторным пахам. Напісаў слова «шпалеры» і падумаў, што яго трэба патлумачыць. Гэта роўныя рады дрэў ці хмызняку, пасаджаныя па два бакі дарогі ці сцежкі. Шпалерамі могуць стаяць і салдаты. І з бэзам яшчэ адна асацыяцыя. Некалі салдатам вельмі добра сцвярэлася і размаўлялася ў сям'і Панізніка і Янішчыц. З таго часу ўрэзаўся ў памяць адзін з яе вершаў пра бэз, які ў юнацтве ім, дзяўчатам, хлопцы прыносілі бярэмамі, наламаўшы яго ў вясковых гародчыках. Шукаў, але не знайшоў яго ў кнігах паэтэсы. А па памяці прыводзіць баюся.

Таксама ўсё радзей можна сустрэць у гародчыках і вяргіню. Яна вырастае пад рост чалавека, дае шмат ценю. Ды і карані трэба восенню выкопваць, да вясны захоўваць.

Ну, і закончу тым, што назіраю каля дамоў новых беларусаў. У іх няма ні жадання, ні часу, відаць, не тое што горад ля дома пасадзіць, але і гародчык завесці. У асноўным раўняюць яны тэрыторыю, засяваюць спецыяльнай траўкай. А потым за лета такі газон трэба толькі некалькі разоў скасіць газонакасілкай, што няцяжка. Роўненька, чыста, але неяк аднастайна. Ды ў апошні час з'явілася ўжо і ў Паставах такая тэндэнцыя. Зялёны газончык і раптам пасярод яго няхай і невялікая, але яркая, кідкая клумба з кветкамі. Міжволі вока «чапляецца» за такую прыгажосць.

Алесь КАСЦЕНЬ.
Віцебская вобласць.

Агародчык

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

7-гадовая жыхарка Глыбокага Юлія СКРАБАТУН даглядае кветнік на бацькоўскім падворку.

Паважаная ***Ніна Міхайлаўна ЧАЙКО!*** *Вітаем вас з днём нараджэння! Моцнага вам здароўя, поспехаў у працы, сямейнага дабрабыту.*

Калектыў работнікаў Аталезскага выканкама. Калектыў работнікаў выканкама г. Стоўбцы.

Паритетбанк

запрашивает ценовые предложения на проектирование и монтаж локальной вычислительной сети в г. Могилеве и в г. Минске.

За дополнительной информацией обращаться по тел.: (017) 288 38 36, (029) 307 18 05 Владимир Иванович.

Лицензия НБ РБ от 27.10.2006 г. № 5.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТА НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА НА АУКЦИОНЕ

ЗАО «ВЦ «АКВАБЕЛ» Минский район объявляет открытый аукцион по продаже объекта недвижимого имущества:

№ лота	Наименование объекта недвижимости	Общая площадь, кв.м	Начальная цена с НДС, бел. руб	Адрес объекта
1	Конюшня	276,6	281 914 286	Минский район, район д. Королев Стан

Задаток в размере 10 % от стоимости лота перечисляется на р/с № 3012204960010 в филиале ОАО «Белагропромбанка» МГД г. Минск, ул. Ольшевского, 24, код 963, УНН 600438617, ОКПО 28976346, ЗАО «Выставочный центр «АКВАБЕЛ» Минский район. Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее 10 дней от даты подписания протокола о результатах аукциона. Аукцион состоится 10 августа 2007 г. в 11.00 по адресу: Минский район, пересечение Логойского тракта и МКАД, Административное здание, отдел коммерческой недвижимости. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 09.08.2007 г. до 17.30 по адресу: Минский район, пересечение Логойского тракта и МКАД, Административное здание, отдел коммерческой недвижимости.

Контактный телефон: +375 17 237-93-93.

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» проводит аукцион по продаже автомобильной техники

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ на 11-м открытом аукционе по продаже объектов республиканской собственности 12 сентября 2007 г.

№ п/п	Наименование техники	Местонахождение объекта	Год выпуска	Пробег в км/ наработка в м/ч	Начальная цена продажи объекта (руб.)	Сумма задатка (руб.)
1	2	3	4	5	6	7
1.	АЦ-9-5337 з.н. 08920556, ш. 4728, дв. 8900749	н.п. Михановичи в/ч 52188Ф	1989	135,0	28 000 000	2 800 000
2.	АЦ-9-5337 з.н. 193, ш. 5102, дв. 8904861	н.п. Михановичи в/ч 52188Ф	1989	3140,0	25 000 000	2 500 000

11-й аукцион состоится в 11.00 12 сентября 2007 г. по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 4, ГО «Белресурсы».

Прием документов на участие в аукционе заканчивается в 17.00 10 сентября 2007 г. по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, комн. 618, РУП «Белспецконтракт».

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, резиденты Республики Беларусь и нерезиденты, оплатившие задаток. Физические лица обязаны предоставить паспорт и заполнить необходимые документы установленного образца. Юридические лица предоставляют необходимый пакет документов.

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи 13 сентября 2007 года.
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Все денежные расчеты производятся путем перечисления их на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012008660018 в Октябрьском отделении ОАО «БелПСБ» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код 357, УНП 101099370. **Без НДС.** Справки по тел.: (017) тел./факс 224-88-05.

Наш адрес в Интернете: www.belspeckontrakt.com e-mail:info@belspeckontrakt.com

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» проводит аукцион по продаже автомобильной техники

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ на 8-м открытом аукционе по продаже объектов республиканской собственности 15 августа 2007 г.

№ п/п	Наименование техники	Местонахождение объекта	Год выпуска	Пробег в км/ наработка в м/ч	Начальная цена продажи объекта (руб.)	Сумма задатка (руб.)
1	2	3	4	5	6	7
1.	АЦ-8-5334 з.н. А8330682, ш. 53916, дв. 650635	п. Красный Берег в/ч 55461Ф	1983	12313	8 000 000	800 000
2.	ППЦ-16.3-5410 ш. 0114262, дв. 247250 з.н. 4512	г. Барановичи в/ч 55435Ф	1984	60750	21 000 000	2 100 000

8-й аукцион состоится в 11.00 15 августа 2007 г. по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 4, ГО «Белресурсы».

Прием документов на участие в аукционе заканчивается в 17.00 13 августа 2007 г. по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, комн. 618, РУП «Белспецконтракт».

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, резиденты Республики Беларусь и нерезиденты, оплатившие задаток. Физические лица обязаны предоставить паспорт и заполнить необходимые документы установленного образца. Юридические лица предоставляют необходимый пакет документов.

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи 15 августа 2007 года.
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Все денежные расчеты производятся путем перечисления их на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012008660018 в Октябрьском отделении ОАО «БелПСБ» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код 357, УНП 101099370. **Без НДС.** Справки по тел.: (017) тел./факс 224-88-05.

По ранее проведенным торгам извещение публиковалось в газете «Звязда» 28 июня 2007 г.

Наш адрес в Интернете: www.belspeckontrakt.com e-mail: info@belspeckontrakt.com

777

Увялікім горадзе складана ўтрымацца ад разнастайных спакус. Лоўкімі паляўнічымі ўжо расстаўлены сеткі ў імкненні завабіць у іх буйную здабычу. І, калі своечасова не раскусіць план гэтых хітрых і прадпрымальных, то залатая рыбка, якая трапіла на кручок, насуперак сваёй волі будзе выконваць усе прыхамаці і пажаданні махляроў — расставацца з апошнімі грашыма з кішэні. Вы самі пераканаліся, як шмат апошнім часам з'явілася розных паслуг, якія гарантуюць стопрацэнтны вынік. У тым ліку, і магічных.

Закон любога бізнэсу: попыт нараджае прапанову. Толькі ад спакуслівых прапаноў — кругам галава: і ўстараніць на шляху непатрэбнага саперніка, пазбавіць ад хвароб, якіх і заваду няма, прываражыць, адваражыць, зняць сурокі і псоту, выправіць матэрыяльнае становішча, каб грошы чэрпаць рыдлёўкай... А як зірнеш у прэйскурант мага, то мурашкі міжволі бягуць па целе: варажба — 10 долараў, устараненне цёмных сіл — 20 — і па нарастаючай. І людзі вераць, бягуць да патомных лекараў і ведзьмакоў, чапляючыся за іх , быццам за апошнюю саломінку. А калі вынік плюс да ўсяго дасягнуты (зразумела, што шляхам самаўнушэння), то тут маг, лікуючы ад перамогі, нясцілпа намякне на большую ўзнагароду. Вось так і перапампоўваюць магічныя авантурысты нашы грошыкі. Іграюць на слабасці. Напрыклад, калі дзяўчыне ну ўжо ніяк не шанцуе на амурным фронце, то тут варыянт такі: на табе, галубка, вянец бясшлюбнасці! Хочаш прынца на белым кані з пасагам, давай адлічвай!

Дык вось, каб не трапіць у пастку, трэба быць заўсёды напагатове. Калі ў жыцці сапраўды настала чорная суцэльная паласа, а выйсця няма, праблемы пакрылі з галавой, то лепшы спосаб іх вырашэння — канструктыўны падыход да іх. І перш чым ляцець да невядомай варажбіткі, для якой вы чарговы «лопух», які трапіў у яе сеткі, трэба паспрабаваць спачатку самому разабрацца ў сваіх праблемах.

Як дзейнічае большасць такіх ліпавых лекараў і магаў? А вельмі проста!

Парачку няхітрых прыёмчыкаў, псіхалагічны фактар тут адыгрывае немалаважную ролю, ну і, зразумела, адпаведны такім магічным рытуалам антураж.

Бяру ў рукі адну сталічную газету. Аб'яў тут шмат. Часам даходзіць да маразму:

♦ Старадаўняя палеская варажба. Аналагаў няма!

♦ Патомная вядзьмарка зніме радавы праклён!

♦ Кадзіраванне на ўдачу!

♦ Празорлівая варажбітка. Дапамагу ва ўсім!

Самае смешнае, што патомных варажбітак тысячы. Калі падлічыць, то атрымліваецца, што ўсе пагалоўна раней гэтым займаліся.

Набіраю нумар мабільнага тэлефона, запісваюся на прыём. Еду! Прыватны сектар у раёне Батанічнага сада. Двухпавярховая струхлелая хатка, брамка на ржавай спружыне. Гаўканне сабак. М-да: выгляд не вельмі прэзентабельны! На парозе жанчына неабдымных памераў, ледзь уціскаючыся ў дзверы, запрашае падняцца на другі паверх, дзе быццам бы пасяліліся касмічныя сілы. Гарыць свечка, і, варажбітка, па ўжо загадзя спланаванаму сцэнарыю, пачынае магічны спектакль. Ёй толькі не хапае высокага каўпака, як у астролага, і чарадзейнай палачкі ў руках. Дык хоць бы ведала, што грошы выкладваю за маляўнічае шоў. Затое прыкупленыя карты ТАРО на кніжным распродажы і вялікі стос з кніг на такую ж тэматыку — смела ідуць у вядзьмаркі ў ход.

— Вось, дачка, дзесятка «мячоў»! — на стол імкліва лягла карта рыцара, паражонага дзесяццю стрэламі!

«Ну, думаю, прыехалі!!! Толькі вось гэтага мне і не хапала...»

Пакуль варажбітка пластрэльвае мяне вачыма, спрабуючы ацаніць, як можна мяне выгадней разуць і расшнураваць, я паддаюся яе правакацыям, падыгрываю.

У выніку ўсё скончылася эпапеяй пра залатую будучыню. Маўляў, будзе ўсё добра, калі буду прыслухоўвацца да яе парад. А параіла яна мне прынесці ёй новыя навалочкі для падушак, каб «прысушыць» любога кавалера, які мне спадабаўся. І на развітанне кінула, што дасць скідку: не сто долараў, як па тарыфу, а — пяцьдзесят. Я абяцала падумаць. І з усмешкай развіталася з дзесяццю баксамі — статуяй амерыканскай свабоды! Рух у пошуках прыгод...

Аказваецца, не толькі ў сталіцы пудраць мазгі «лапавухім зайцам». У далёкай глухамані, у вёсках ведзьмакі, згодна з традыцыяй, самыя што ні ёсць сапраўдныя. Але ўжо і там ва ўсю кіпіць няхітры бізнэс. Прайдзісветы вараць грымучую сумесь і чакаюць не дачакаюцца лёгкай нажывы. І калі ў ранейшыя часы, сусед, у якога, напрыклад, занядужала карова, за куда-варажбу мог адкупіцца кавалкам сала з хлебам, то сёння нямала з пенсіі сціпла ляжа ў кішэнь «уладара лохаў». Незвычайнай і планетамаштабнай цудадзейнай сілай праславіў сябе адзін дзед з прыбярэжнай вёскі пад Магілёвам. Паводле расказаў відавочцаў, ад аднаго яго погляду нават трактары і камбайны ў каласістым полі становяцца на дыбы! Ведае тысячы старадаўніх загавораў і малітваў, што любая чалавечая і не толькі хвароба яму паў сілу. Спіс жадаючых такі вялікі, што, калі прызначаюць прыём праз месяц, то ты шчасліўчык!

Спачатку трубку вясковага тэлефона знімала жонка, спасылаючыся на непамерную занятасць мужа і яго часовую адсутнасць у далёкай камандзіроўцы. Але настойлівасць і цікавасць да «нераскручанай» персоны ўзялі верх. Праз два тыдні вядзьмак аб'явіўся на сувязі.

— Але трэба яшчэ прайсці курс!

Тут рэзка хтосьці пастукаў у дзверы. Свечка гарэла, а на вуліцы ва ўсю разгортваліся базарныя баталіі.

— Чуеш ты, вядзьмак, дай мне пяць тысяч на бутэльку. Я табе гной прывозіў!

— Нічога табе не дам, каціся адсюль! — даносіўся раздражнёны голас гаспадара.

— Я тут усю вёску прасвятлю, чым ты займаешся!

І тут мяне як асяніла. Звычайны калгаснік дурыць мазгі насельніцтву. Плаціць падаткі за сваю дзейнасць. Толькі, цікава, куды глядзяць гэтыя падаткавікі? І дзе ліцэнзія на падобны від дзейнасці?

Дык мала таго, што сядзеў бы чмель у сваіх сотах і далёка не лётаў. Дык вырашыў праславіцца на ўсю шырокую грамадскасць. Стварыў сабе рэкламу ў адной са сталічных тыражных газет. Карэспандэнтка так прыгожа распісала ўсе яго вартасці, што народ, збіты з толку падобнымі шарлатанамі, паваліў туды гуртам. Калі ты трактары можаш перасоўваць, амерыканцы да цябе едуць за тысячы кіламетраў, то чаму прыём праходзіць не ў цэнтры, як у дыпламаваных спецыялістаў, а ў трушчобе наводшыбе? Дзе пра такія нечуваныя магчымасці не ведае нават цвыркун?

Празорліўцаў у Беларусі хоць гаць гаці. Сяброўка маёй мамы неяк пабывала на прыёме ў адной з іх. Расказала пра фантастычныя здольнасці праз фотаздымак знаходзіць след забойцаў. Жанчына жыве пад Фаніпалем, у глухім мястэчку. Даведаўшыся ў яе адрас і як да яе дабрацца, я адправілася ў дарогу. Праўда, адшукаць чараўніцу ўдалося з цяжкасцю. Пра яе ў наваколлі толкам ніхто не чуў, а бабка-суседка, пераблытаўшы варажбітку са сваёй дачкой, сказала шукаць яе ў самім Фаніпалі.

Праўду сказаць — цырк. Дачку давялося шукаць праз адраснае бюро, а калі я прыехала па ўказаному адрасу, спалоханая жанчына аж выкаціла вочы:

— Якая празорлівая? Ну, вас ясна бачу! — усмешка. — А-а, дык вы нашу суседку шукаеце. Дык вярнулася ў сне ўбачыш ворага, хто навёў на цябе гэтую псоту. Ну, дык, з цябе 50 тысяч. Пасля сеанс будзе 40, затым 30, затым — 20. Ну, і калі дзесяць, то гэта заключны сеанс.

Дзед, канешне, напалохаў сваімі заключэннямі. І я вырашыла з'ездзіць да яго яшчэ раз. Толькі не прытрымлівацца прапісанага курса. Што ён скажа?

Другі раз дабіралася аўтобусам, які прытармазіў каля вёскі. Так што сама дарога была не вельмі стамляльнай.

— Справы ідуць на папраўку! — дзед прымаў мяне ўжо ў верандзе.

Карэспандэнт «Звязды» адправіўся ў магічнае падарожжа

— Дзве бутэлькі чырвонага віна, блок цыгарэт. Тры пластмасавыя паўтаралітровыя бутэлькі вады з трох калодзежаў, каробка шакаладных цукерак і кілаграмовы пачак буйной солі. Чуеце? Ды і ледзь не забыўся: першы сеанс — пяцьдзесят тысяч...

Пакуль я ў сваім мозгу складвала пасьянс патрэбнага спісу, сума расходаў вымалёўвалася прыстойная. Вядзьмак дасведчаны вунь які: і выпіць, як кажуць, і закусіць. Яшчэ і дымком пабалавацца! А калі сушняк стане мучыць, то можна з ахвоты і да вады дарвацца.

Улічыла ўсе наказы дзеда. Але дзе ж мне ў горадзе знайсці тры калодзежы? Добра, што мая бабуля жыве недалёка ад Мінска, у вёсцы. Там мы з ёй і начэрпалі з гэтых трох вядзёр у бутэлькі. Суседзі, не ўведзеныя ў курс справы, круцілі ля скроні. Але гэта быў толькі пачатак вялікай камедыі.

Мала таго, што прыйшлося ехаць начным цягніком да самага Магілёва, назіраючы з вакна, як перавозяць зняволеных, дык яшчэ і ад Магілёва праз лес досвіткам давялося ісці пешшу кіламетраў сем да самай вёскі, а там яшчэ і па вёсцы кіламетры два да дома з «бусліным гняздом».

Непрыгожая хата, абшарпаная падлога. Увогуле, звычайная бытоўка. На стале пачкі солі. Чорны кот, добра набіўшы бруха, жмурыцца наўскос каля дзвярэй. Дзядуля ў рагавой аправе бярэ блакнот і пачынае анкетаванне. Пасля просіць падаць бутэлькі з вадой. Адкаркоўвае бутэлькі, вось у ход пайшло вінo — штосьці шэпча ў прашчыліны. Гэта трэба было бачыць! Затым дзед занёс над вадой свечку, якая стала патрэскваць, і сказаў, што гэта цуд, што я своечасова трапіла да яго ў рукі, што жыццё маё на валаску, маўляў, бачыш, засталося з камароў нос.

— Але я цябе вылечу, не бойся! — пераконваў дзед. — Праз два тыдні прыедзеш з тым жа багажом: віно, цыгарэты, соль. Вось табе паперка, абыдзеш з ёй наваколле, рассыпаючы соль. Потым ваду пакладзеш пад падушку, а ноччу ў сне ўбачыш ворага, хто навёў на цябе гэтую псоту. Ну, дык, з цябе 50 тысяч. Пасля сеанс будзе 40, затым 30, затым — 20. Ну, і калі дзесяць, то гэта заключны сеанс.

Дзед, канешне, напалохаў сваімі заключэннямі. І я вырашыла з'ездзіць да яго яшчэ раз. Толькі не прытрымлівацца прапісанага курса. Што ён скажа?

Другі раз дабіралася аўтобусам, які прытармазіў каля вёскі. Так што сама дарога была не вельмі стамляльнай.

— Справы ідуць на папраўку! — дзед прымаў мяне ўжо ў верандзе.

— Ёсць адна бабуля, што ў Заводскім раёне, — сцвярджала прыбіральшчыца на радыёстанцыі, дзе я працавала ў свой час, — бачыць усю тваю будучыню праз ваду.

Бабка прызначыла час, а калі я пад'ехала да дома і стала званіць ёй з мабільнага, тая закрычала:

— Хочаш, каб сабакі цябе парвалі? Заходзь. А я хворая зараз. Вылечуся, прыязджайце.

Ды да такой бабкі і на гарманты стрэл страшна падабрацца, а не тое, што спрабаваць увайсці другі раз у раку. Такая, відаць, не лечыць, а калечыць.

У Курасоўшчыне, у Мінску, таксама ёсць жанчына, што, дзякуючы вадзе, адахвочвае алкаголікаў ад спіртнога, заядлых курцоў — ад тытуню. Сеанс можа праводзіць і пры адсутнасці самога кліента. Патрабаванні: вада і чысты ручнік.

Народ да яе ідзе, а суседзі толькі пасміхаюцца:

— Во баба дае! Сын — алкаголік, вылечыць свайго не можа, а іншых падманвае. Малайчына!

Але пакуты на г

Золак, убачаны здалёк...

4 жніўня спаўняецца 90 гадоў з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі Янкі Брыля

Нямногія ведаюць, што гэты чалавек па-сапраўднаму энцыклапедычнага досведу скончыў... толькі сямігодку. Але ўвесь час ён займаўся самаадукацыяй.

Жыццёвы шлях гэтага ўнікальнага чалавека быў няпростым. У 1939 годзе жыхар Заходняй Беларусі Янка Брыль быў прызваны ў польскую армію, у верасні трапіў у нямецкі палон, адкуль уцёк у 1941-м... З 1942 года ён быў сувязным партызанскай брыгады імя Жукава Баранавіцкага злучэння, потым — партызанам-разведчыкам брыгады «Камсамолец», рэдактарам газеты «Сцяг свабоды» і сатырычнага антыфашысцкага лістка «Партызанскае жыгала». З кастрычніка 1944 года — у Мінску, працаваў у рэдакцыі газеты-плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну», у часопісах «Вожык», «Маладосць», «Полымя», у Дзяржаўным выдавецтве Беларусі...

Янка Брыль — аўтар рамана «Птушкі і гнёзды», аповесцяў «У Забалоцці днее», «Ніжнія Байдуны», «Золак, убачаны здалёк», многіх іншых. Шырокае прызнанне атрымалі лірыка-філасофскія мініяцюры, псіхалагічныя абразкі Майстра.

* * *

Іван Антонавіч Брыль заўсёды сябраваў са «Звяздой» і звяздоўцамі. Вось што расказаў старэйшына нашай газеты, легендарны беларускі журналіст Янка Казлоў:

— Мы з Іванам Антонавічам разам сустракалі новы 1945 год. Як усё атрымалася?.. У 1944-м мы працавалі ў Доме друку, я ў «Звяздзе» — на 2-м паверсе, а Брыль у «Вожыку» — на 4-м паверсе. Сустракаліся на перакурах: абое, былыя партызаны, любілі смаліць... Неяк Іван Антонавіч і пытаецца:

— Ты дзе будзеш сустракаць Новы год?

Паціснуў плячыма: не ведаю.

— Дык прыходзь да мяне, брат прывязе мяшок сухароў, добра пасядзім!

Брыль здымаў пакойчык непадалёк ад Дома друку, на вуліцы Акадэмічнай. 1945 год сустракалі надзвычай весела. Як водзіцца сярод славян, узялі на чарцы — ды песні спявалі! Іван Антонавіч — найвыдатнейшы чалавек, цудоўны суразмоўца.

* * *

...У студзені 2006 года «Звязда» распачала акцыю «Нашчадкі вогненных вёсак» — гэта быў крок своеасаблівага працягу дакументальнай кнігі «Я з вогненнай вёскі...» Алеся Адамовіча, Янкі Брыля і Уладзіміра Калесніка. Кніга была напісана праз 30 гадоў пасля вайны (выйшла ў 1975-м). Прайшло яшчэ 30 гадоў. Многіх Сведкаў Праўды, як назвалі сваіх суразмоўцаў аўтары, ужо няма, але сведкі жудасных трагедый «вогненных вёсак» яшчэ застаюцца.

У пачатку XXI стагоддзя пачалі з'яўляцца спробы перапісаць гісторыю Вялікай Айчыннай вайны — гісторыю народнай трагедыі, народнай барацьбы і народнай Перамогі. Таму «Звязда» папрасіла адгукнуцца ўсіх, каму пашчасціла выжыць у вогненным пекле родных вёсак.

...13 студзеня 2006 года я патэлефанавала Івану Антонавічу, каб атрымаць своеасаблівае бласлаўленне на правядзенне гэтай патрыятычнай акцыі і папрасіцца на інтэрв'ю.

Ад інтэрв'ю Брыль катэгарычна адмовіўся — успаміны пра работу над кнігай «Я з вогненнай вёскі...» надта цяжкія.

Настрой у пісьменніка быў прыўзняты.

— А ці ведаеце вы, Таццяна, што сёння Куцця? За работай мо і забыліся... Ужо мала хто ведае, што сапраўдную куццю трэба гатаваць са свіным вухам. Абавязкова — са свіным вухам!..

І Брыль падрабязна расказаў, як рыхтаваліся да гэтага свята даўней, калі ён яшчэ быў хлапчуком... Потым размаўлялі пра агульных знаёмых, пра нашу апошнюю сустрэчу... Што мяне зусім уразіла — ён памятаў, адкуль я родам, якія даўнія мае публікацыі яму спадабаліся.

Ну і памяць!..

...На прапанову рэдакцыі адгукнуліся сведкі «вогненных вёсак» з многіх куточкаў Беларусі, іх пісьмы друкаваліся на старонках «Звязды». А ў дзень 65-годдзя пачатку Вялікай Айчыннай вайны, 22 чэрвеня 2006 года, у Хатыні сабраліся ўдзельнікі акцыі — каля 30 чалавек, пра некаторых з іх пісалі аўтары кнігі «Я з вогненнай вёскі...».

У канцы ліпеня 2006 года Янка Брыль пайшоў з жыцця. Адзін са шматлікіх вянкоў ля яго труны быў ад нашчадкаў «вогненных вёсак»...

* * *

Я патэлефанавала ў Брэст. Удава пісьменніка Уладзіміра Калесніка Зоя Міхайлаўна расказала:

— Іван Антонавіч Брыль і Уладзімір Андрэевіч Калеснік сябравалі яшчэ з партызанаў. Гэта было пасапраўднаму мужчынскае сяброўства — вернае, шчырае, адданае. Я пазнаёмілася з Брылём у нас у Брэсце: ён прымаў удзел у творчай вечарыне. А потым, ужо ў Мінску, пазнаёмілася і з яго жонкай Нінай Міхайлаўнай — вельмі добрай, мілай жанчынай. Мы шмат разам падарожнічалі, з намі быў і Алесь Адамовіч: Далёкая Поўнач, Прыбалтыка, Карпаты. Іван Антонавіч, без перабольшання, быў душой нашай невялікай кампаніі — вельмі ўважлівы, вытрыманы, клапатлівы. І надзвычай цікавы суразмоўца. Вечарамі мы збіраліся ў адным нумары гатэля, дзяліліся ўражаннямі, успамінамі. Брыль з іскрынкай гумару распавядаў пра сваё юнацтва, маладосць. Часта гэтыя ўспаміны суправаджаліся песнямі — беларускімі, рускімі, польскімі, украінскімі... У яго быў добры голас, усе атрымлівалі асалоду ад гэтых спеваў... Падарожжы нашы перапыніліся, калі пісьменнікі пачалі збіраць матэрыялы для кнігі «Я з вогненнай вёскі...». Наведалі ўсе вёскі, спаленыя немцамі, запісвалі ўспаміны... Амаль пяць гадоў працавалі над кнігай. З паездак вярталіся ў такім настроі пасля ўсяго ўбачанага і пачутага... А потым «расшыфроўвалі» магнітафонныя плёнкі — і зноў яшчэ раз перажывалі гэты боль спаленых вёсак...

Таццяна ПАДАЛЯК.



Фота Анатоля КЛЕЦКАЎКІНА.

ПАКЛОН

ІВАН АНТОНАВІЧ БРЫЛЬ з таго выбітнага шэрагу яркіх асобаў, якімі адвеку ўпрыгожваецца і чалавечыцца свет.

Няхай дарагі Сябра даруе, але сёння я, можа, не буду гаварыць пра Яго як пра пісьменніка. Ён ведаў, што я вельмі люблю ўсе яго творы, асабліва лірычныя мініяцюры, нататкі, запісы, — ад першай «Жмені сонечных промняў» да апошняга «Парастка». Ведаў, што ў маім успрыманні Ён — найлірычнейшы, найпаэтычнейшы празаік у беларускай літаратуры, глыбокі думаннік, які шмат што пабачыў, багата чаго ператкаваў і пераасэнсаваў, каб па-майстэрску цікава, проста і мудра сказаць і людзям «трошкі пра вечнае» і нявечнае. Ды зараз я хацела б запыніцца на крапялінку іншым, хоць і неаддзельным ад літаратуры ў постаці Янкі Брыля.

Не намі даўно і слушна заўважана, што сапраўдны мастак ёсць сведка свайго часу, выказнік яго этыкі, эстэтыкі, маралі. Сваё ранняе творчае пакліканне сведчыць Янка Брыль разумеў найперш як абавязак развіваць і ўмацоўваць вартасці ўласнай душы. Таму што творчасць — гэта самавыяўленне індывідуума ў найлепшай яго іпастасі. Калі яно ўдалае, калі ў творы чуваць голас жывой душы з яе радасцямі і пакутамі, з усёй паўнатой невымернай яе любові, толькі тады твор набывае мастацкую, духоўна-эстэтычную вартасць і здольны, па перакананню Янкі Брыля, паслугаваць на карысць людзям.

Гаварыць пра Івана Антонавіча і лёгка, і няпроста. Гэта быў вялікі сэрцам, надзвычай чулы, уважлівы і клапатлівы чалавек, які прыкметна вылучаўся і ў літаратурным асяроддзі. І нават не гэтак сваёй магутнай, кідкай статурай, дакладней, не адзіна ёю, а выяўнай моцай унутранай свабоды, шчырай прыязнасці і шляхетнай годнасці, наўпрост адчувальнай і дужа вабнай. Мы ж ведаем, што Янка Брыль гадаваўся і рос у шараговым малапісьменным вясковым асяродку. Чыстая, уразлівая душа малога летуценніка вельмі чуйна адклікалася на навакольны свет, — і на боскую прыгажосць родных прынёманскіх краявідаў, і, канешне ж, на ўбогасць людскога існавання на тле таго хараства. Яго жахала і гідзіла любая праява чалавечага самаапушчэнства — брыдотнае п'янства, бязглуздыя крывавыя разборкі, безагляднае мужычае хамства, звыклае вяршэнства тупасці, абразы і грубай сілы над розумам і сэрцам... Янка Брыль адмалку ведаў, якім быць ён не хоча. А каб стаць такім, якім хоча, удумлівы юнак цвёрда накрэсліў сабе праграму паводзінаў у социуме: не піць, не паліць, не брыдкасловіць, паважаць людзей і не знацца са злыднямі, як мага трымацца праўды, сумлення і чалавечнасці. Рашуча ўсклаў на самога сябе адказнасць за ўласны жыццёвы і творчы лёс. І ніколі не парушыў таго свайго рамантычнага юначага зароку. Таму й патрапіў так годна пражыць доўгае, нялёгкае, няпростае жыццё. Таму й застаецца ў нашай падзячлівай памяці ўзорам светлага, сціплага, нястомнага працаўніка, які самаруч узняў сябе на крутую гару заслужанай літаратурнай славы, нязменнай людской павагі й пашаны. Узорам сапраўднага Чалавека і выдатнага Пісьменніка.

Ніна МАЦЯШ.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

КЛАСІФІКАЦЫЙНЫ КОНКУРС

Працягваем класіфікацыйны конкурс на прызы нашага шчодрага чытача — навукоўца Івана Іванавіча АСТРОЎСКАГА (Мінск). Нагадваем, што, акрамя таго, яго пераможцы маюць магчымасць выканаць альбо пацвердзіць норму першага спартыўнага разраду па шашках, а развязаўшыя ўсе 12 заданняў — другога. За знаходжанне пабочных развязак або доказ, што пазіцыя не мае рашэння, налічваюцца дадатковыя ачкі. Таму будзьце ўважлівымі.

У якасці чарговых заданняў прапануем камбінацыйную праблему і эцюд:



№ 3. БЕЛЫЯ: a3, e3, f2, g5, h6 (5). ЧОРНЫЯ: b4, b6, c5, d6, e5, f8, h2 (7). Выйгрыш.



№ 4. БЕЛЫЯ: a7, g1 (2). ЧОРНЫЯ: a3, h4, дамка g3 (3). Нічыя.

У абедзвюх кампазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Тым, хто з імі справіцца, будуць залічаны і аўтарскія рашэнні першых двух заданняў.

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас рэдакцыі газеты «Звязда»: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а. Рубрыка «Шашкі».

Конкурс прысвячаецца 90-годдзю газеты «Звязда».

ЧЭМПІЯНАТЫ, ФЕСТЫВАЛЬ

У Якуцку прайшоў чэмпіянат свету па міжнародных шашках сярод жанчын. У чацвёрты раз пераможцай расіянка Тамара Тансыккужына. Другое—трэцяе месцы падзялілі Дар'я Ткачэнка (Украіна) і Марфа Данілава (Расія). 11-разовая ўладальніца кароны Зоя Голубева з Латвіі (экс-мінчанка) і двойчы віцэ-чэмпіёнка Ірына Пашкевіч (Беларусь) увайшлі ў шасцёрку мацнейшых.

На рускіх жа шашках адбылося першынство Еўропы ў Днепрапятроўску. Тут вылучыліся расіяне Іван Токусараў і Гаўрыіл Колесаў, украінец Валерый Грабёнкін. Экс-чэмпіён свету Андрэй Валюк (Гродна) і цяперашні чэмпіён краіны Мікалай Кадзеснікаў (Бабруйск) выступілі ніжэй сваіх магчымасцяў: першы з іх замкнуў васьмёрку, а другі нават не трапіў у фінальную частку спаборніцтваў.

А ў Мінску тым часам ладзіўся 20-ы фестываль па міжнародных шашках. Галоўны турнір выйграў Сяргей Насевіч (Беларусь), за ім размясціліся Аляксей Домчаў (Літва) і Андрэй Толчыкаў (Беларусь). У адкрытым турніры тройку прызёраў узначалілі Арцём Іваноў (Украіна), Аркадзь Плакхін (Беларусь) і Кірыл Чулкоў (Расія). Пазнаёмімся з фрагментам гэтых спаборніцтваў, у якім белыя здолелі звязаць чорных:



БЕЛЫЯ: 27, 28, 34, 39, 40, 47 (6). ЧОРНЫЯ: 7, 13, 18, 24, 25, 26 (6). 1. 28-23 2. 34:23 7-12 3. 27-22 24-30 4. 23-19! 5. 40-35x.

Вяртаючыся да надрукаванага

ЗАБЛУДЗІЛАСЯ?

У нашай газеце быў надрукаваны артыкул «Добрыя людзі» («Звязда», 20 студзеня 2006 г.), у якім расказвалася пра тры сям'і з Ляхавіцкага раёна — яны ўзялі дзяцей-сірот. Гераінямі таго аповеду былі і Алена Кулак з вёскі Шчэрбава, і дзяўчынка з Ястрэмбельскага інтэрната — Марына. Алена Фляр'янаўна тады не магла нахваліцца і нарадавацца. Маўляў, такая разумная і гаспадарлівая дзяўчынка.



— У мяне дачкі няма, а толькі дарослыя хлопцы, але лепшай я не хацела б, — сказала падчас нашай сустрэчы А. Кулак.

І вось праз год, на аўтобусным прыпынку мне трапляецца на вочы аб'ява з партрэтам дзяўчынкі. Цяпер яе шукае міліцыя і ўжо хутка будзе 4 месяцы, як дзяўчынка прапала. Безумоўна, тэрмін даволі вялікі і тут у галаву могуць прыйсці самыя трывожныя думкі — 15-гадовая дзяўчынка ў нашым неспакойным свеце — як сарваны лісток на ветры.

Але лепш за ўсё будзе паслухаць Алену Фляр'янаўну.

— Усё пачалося пасля дня нараджэння Марыны. На пятнаццацігодзе мы падарылі дзяўчынцы грошы. Назаўтра яна папрасілася паехаць на рынак у Ляхавічы, каб купіць нейкую сабе рэч з адзення. Я адпускаць не хацела, але Марыну падтрымала нявестка і яна паехала са сваёй сяброўкай Кацяй. У абед аўтобус прыходзіць, а Марыны няма. Я да сяброўкі, а тая кажа, што Марына паехала ў Баранавічы. Вядома ж, я моцна расхвалявалася, але нічога, вечарам, калі было ўжо цёмна, дзяўчынка прыехала. Вось гэта была яе першая правіннасць. Праўда, гэта калі цяпер аналізаваць усё, то той момант прыходзіць у галаву, а тады хутка ўсё забылася, бо нічога ж не здарылася. Але ў хуткім часе сітуацыя пачала ўскладняцца. Марына хадзіла на дыскатэку ў Галаўнінцы, за тры кіламетры і вярталася да 12 гадзін ночы. Я званіла дырэктару клуба і старалася трымаць сітуацыю пад кантролем. Ва ўсякім выпадку ведала, ці была там дзяўчынка і калі з той дыскатэкі пайшла. Вядома, што і 12 гадзін пазнавата, асабліва ў зімовы час, а калі Марына вярнулася з дыскатэкі ў дзве гадзіны ночы, а затым і ў тры, то я сказала ёй, што больш ніякіх дыскатэк не будзе. І дзяўчынка ў лютым і сакавіку ўжо ў клуб не хадзіла. А затым ўсё ж упрасіла адпусціць, пры гэтым паабяцала вярнуцца да дванаццаці. Я паверыла, але Марына зноў прыйшла ў тры. Раніцай адбылася размова і я сказала, што пакуль ёй не споўніцца шаснаццаць, то ніякіх начных дыскатэк не будзе. У гэты ж дзень Марына пайшла да сваёй сяброўкі забраць веласіпед і ўжо дамоў не вярнулася. Напачатку Каця не гаварыла, дзе Марына, а затым прызналася, што пазычыла ёй дзесяць тысяч, дала сваю сумачку і правяла да аўтамагістралі — Марына паехала ў Баранавічы на пару дзён. Здарылася гэта 16 сакавіка. Мы на машыне кінуліся шукаць, але ўсё ўпустую.

Вось такая сумная гісторыя. І Алену Фляр'янаўну можна зразумець, бо адказнасць за дзяўчынку на сям'і ляжала. Узяў сірату ў хату, каб дзіця не аступілася. Дзе яна ноччу ходзіць? А мо хто пакрыўдзіў? І як тут заснуць?! І сёння гаспадыня ніводнага кепскага слова не кінула ў адрас дзяўчынкі і чакае, што тая вернецца.

Магчыма, уся праблема ў пераходным узросце і дзяўчына закахалася?

— Я ўпэўнена была, што закахацца яна не магла, бо ўвесь час гаварыла пра тое, каб пайсці ў кляштар. А чаму туды? — А нехта ж павінен за грахі сям'і адплачваць — кажа. А я настройвала Марыну на вучобу, каб пайшла вучыцца пасля школы ў інстытут, — расказвае А. Кулак, — залатое дзіця было. Я ведала ўсе яе сакрэты і не думаю, што дзяўчынка хітрыла. А можа і закахалася, але ж ніхто ёй не званіў. Цяпер я не ведаю, што думаць і ў што верыць.

Пасля ўсяго гэтага нехта гаворыць, што з дзяўчынкай трэба было быць больш строгай, а другія наадварот — улічваючы пераходны ўзрост, неабходна было абыходзіцца мякчэй. Гаварыць можна, асабліва калі цябе асабіста гэта не датычыцца. Тут бывае цяжка разабрацца са сваім дзіцем, а што рабіць, калі ў хаце чужое?

Безумоўна, тут ёсць нітачка, пацягнуўшы за якую, можна прыадчыніць тайну зыходу дзяўчынкі. Пра нешта не хоча гаварыць яе сяброўка. Напэўна ж, і не сакрэт, з кім на дыскатэках Марына сустракалася. Хто яе праводзіў дамоў, ці яна ноччу тры кіламетры ішла адна? Зачэпка ёсць.

Магчымы і іншыя варыянты...

Алена Кулак просіць усіх, хто ўбачыць Марыну Фядотаву, пазваніць па тэл. 8-01633-2-32-08 ці ў міліцыю.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Скарпіёнам не варта рабіць дарагіх пакупак, а Стральцам — ленавацца

АВЕН. Пажадана больш уважліва аднесціся да дзелавых праектаў. Якіх-небудзь непрадбачаных праблем тыдзень не рыхтуе. Рэалізацыя вызначаных планаў павінна прайсці на добрым узроўні. Каб не сапсаваць адносіны з роднымі, у аўторак не прымайце нічога на веру, правярайце ўсю інфармацыю, якую атрымліваеце. Неардынарная ідэя ў панядзелак здольная даць штуршок, які дазволіць атрымаць максімальную выгаду з сітуацыі, якая склалася. У аўторак вам проста неабходна праявіць актыўнасць у прафесійнай галіне.

ЦЯЛЕЦ. Давядзецца штосьці мяняць — ці ў адносінах з блізкімі людзьмі, ці з калегамі па рабоце. У панядзелак для ажыццяўлення вашай задумы спатрэбіцца зусім няшмат цярпення і крыху ўдачы. У сераду пастарайцеся не дапускаць агрэсіі і злосці — як з вашага боку, так і з боку навакольных. Пастарайцеся змякчыць напружаную абстаноўку і пераключыць увагу на прыемныя думкі. У другой палове тыдня магчымы нечаканы паварот да лепшага ў партнёрскіх адносінах ці судовых справах. Гэта адбудзецца дзякуючы з'яўленню новай інфармацыі. Узрасце ваша камунікабельнасць і ўдачлівасць па частцы завядзення новых знаёмстваў.

БЛІЗНЯТЫ. Ініцыятыва і актыўнасць могуць быць несвоечасовымі, асабліва ў пачатку тыдня. У сераду лепш не планаваць нічога сур'ёзнага. Калі паўстане пытанне аб звышурочнай рабоце, пажадана не адмаўляцца. Толькі рэальна ацаніце свае магчымасці, перш чым даць згоду. Чацвер можа парадаваць важнай інфармацыяй. Пільна сачыце за развіццём сітуацыі на рабоце. Не выключана, што вас могуць падставіць. Спатрэбіцца асабліва ўважлівасць пры рабоце з дакументамі і паперамі. У суботу не адмаўляйцеся ад вечарынкі.

РАК. Сіняя птушка можа зляцець вам прама ў рукі. Цяпер важна не спалохацца раптоўнай удачы і не пачаць мітусіцца на радасцях. Панядзелак варта прысвяціць вырашэнню сямейных праблем: удзяліце час дзецям. У сярэдзіне тыдня пастарайцеся адмовіцца ад работы: залішняя занятасць не толькі не пакіне часу, каб радавацца жыццю, але можа негатыўна адбіцца на здароўі. Нядзеля спрыяльная для тых, хто шукае мудрасці ці абароны.

ЛЕЎ. Неразбярыха, якая вас акружала, паступова адступае. Пачынаюць праяснядца адносіны з блізкімі і не вельмі блізкімі людзьмі. Выпраўляюцца справы на рабоце. Зараз галоўнае — не фарсіраваць падзеі. У панядзелак пажадана заклікаць на дапамогу ўсе вашы дыпламатычныя здольнасці, каб утрымаць крохкую раўнавагу сітуацыі, якая склалася. У чацвер магчыма цікавая дзелавая прапанова: не згубіце яе з поля зроку. У пятніцу практычна на кожным кроку вас могуць падпільноўваць пасткі і небяспечнасці.

ДЗЕВА. Можаце праяўляць небывалую актыўнасць. Вырастуць адначасова і вашы запросы, і патрабаванні ў дачыненні да сябе, і прэтэнзіі да навакольных. У панядзелак найбольш паспяхова пойдуць справы, якія звязаны з дзелавым партнёрствам. Аўторак можа аказацца ўдалым днём для пераходу на новую работу. На пятніцу не варта планаваць нічога сур'ёзнага: вашы намеры наўрад ці ажыццявяцца ў тым выглядзе, у якім яны былі задуманыя. У нядзелю можна чакаць падтрымкі і спачування з боку родных.

ШАЛІ. Могуць абвастрыцца пытанні кар'еры і ўлады, але калектыў вас падтрымае. Ды і абстаноўка на рабоце значна палепшыцца. Не бойцеся прымаць важныя рашэнні не толькі за сябе, але і за іншых. Вы адчуеце, што неабходныя начальству і супрацоўнікам. Аднак не паддавайцеся на ліслівасць і не ўсыпляйце сябе дыфірамбамі навакольных, а то не мінуць зоркавай хваробы. Вашы дасягненні патрабуюць пацверджання практыкай — і магчымасць даказаць і адстаяць свае пазіцыі ў вас з'явіцца. Час задумацца пра адпачынак, калі вы яго яшчэ не адгулялі. Родныя могуць наладзіць вам вясёлае жыццё.

СКАРПІЁН. Могуць спатрэбіцца такія якасці, як спакой, разумнасць і вытрымка. Магчыма, калегі не заўсёды будуць пра вас самага лепшага меркавання, але да іх слоў не варта прыслухоўваца ўсур'ёз. Непажадана легкадумнасць у зносінах. Пастарайцеся таксама нічога без залішняй неабходнасці не абяцаць, бо выкананне абяцанага будзе звязана з некаторым напружаннем і цяжкасцямі. Лепш займіцеся наладжваннем новых сувязяў і кантактаў. Шукаць чужой парады варта толькі ў выключных выпадках. Узровень вашых прэтэнзій у кар'ерных пытаннях можа не ўлічваць бягучых магчымасцяў. Звярніце на гэта ўвагу. Пазбягайце рэзкіх жыццёвых перамен і вельмі дарагіх пакупак. У сераду пажадана не трапляць на вочы начальству. Затое з чацвярга смела можаце ў яго прысутнасці ўносіць канструктыўныя прапановы.

СТРАЛЕЦ. Спрыяльным тыдзень стане для тых, хто прывык быць актыўным і любіць змагацца з цяжкасцямі. А іх будзе дастаткова. І першая, яна ж галоўная, — лянота. Пастарайцеся перамагчы яе і справіцца з дрэнным настроем — тады ўсё пойдзе як па маслу. На жаль, вашу работу за вас усё роўна ніхто не зробіць. Будзьце ўпэўнены: ваша працавітасць не прападзе дарэмна, а будзе ацэнена начальствам у поўнай меры. Калі вы не захочаце праявіць творчасць і ініцыятыву самастойна, вас усё роўна прымусяць працаваць, але ўмовы будуць значна горшымі.

КАЗЯРОГ. Пастарайцеся выконваць работу своечасова — гэта пазбавіць вас ад лішніх цяжкасцяў. Ваша працавітасць будзе заўважана і ацэнена. Большасць планаў ажыццявіцца. Начальства можа пайсці насустрач, калі вам спатрэбіцца больш вольны рэжым работы. У аўторак не варта падаўляць творчыя імпульсы. Не лянуйцеся рэалізаваць свой патэнцыял. У сераду незалежнасць і ўпэўненасць у сабе прынясуць поспех. Надайце дастаткова ўвагі сям'і і дому, але праз сілу лепш нічога не пачынаць. Будзьце гатовыя да таго, што давядзецца пастаянна адрознівать стомленасць ад ляноты.

ВАДАЛЕЙ. Старайцеся не назапашваць бягучыя справы. Будзьце больш уважлівыя: памылкі, якія зробіце, маюць уласцівасць ускладняць вам жыццё. Аўторак будзе ўдалы для паездак і камандзіровак. У сераду пажадана не сварыцца з начальствам і наогул паменш трапляцца яму на вочы. Непажадана сунуць нос у чужыя справы — лепш спачатку разбярыцеся са сваімі шматлікімі праблемамі. У чацвер удала вырашацца кар'ерныя пытанні. У пятніцу будзьце больш уважлівыя і асцярожныя з дзелавымі паперамі і пры афармленні дагавораў і здзелак. Родным можа спатрэбіцца ваша дапамога і падтрымка — пастарайцеся апраўдаць іх давер. Прысвяціце выхадныя адпачынку на прыродзе.

РЫБЫ. Пастарайцеся засяродзіцца на бягучай рабоце. Менавіта ад гэтага будзе залежаць паспяховасць вашага існавання на гэтым тыдні. Нават калі вам не вельмі падабаецца цяперашняе месца работы (напрыклад, не хапае прасторы для самастойнай дзейнасці), не спяшайцеся шукаць новую галіну прыкладання сваіх працоўных рэсурсаў. Новыя знаёмствы зараз на рэдкасць канструктыўныя, карысныя і прыемныя. Пастарайцеся іх не пазбягаць. Дзелавым людзям зоркі рэкамендуюць заняцца пошукам новых партнёраў. І галоўнае — больш рашучых дзеянняў. У іх — ваш поспех.

Формула ўдачы

Волагда і нашы песні

На фестывалі ў Волагдзе выдатна ацанілі спектакль «Адвечная песня» паводле Янкі Купалы.

Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі прывёз з фестывалю «Галасы гісторыі» прыз «За паэтычнае адлюстраванне лёсу беларускага народа». Для рэжысёра Сяргея Кавальчыка, які паставіў спектакль, гэта не першы поспех за лета на міжнародных фестывалях. І калі праца «Сёстры Псіхеі» па-за часам і па-за культурамі, то беларуская паэтычная класіка на сцэне — рэч асабліва, яе не толькі трэба разумець, але і адчуваць. Але расійскі глядач паставіўся прыязна да беларусаў, якія аднойчы ўславілі горад Волагду, праўда, у песні. Цяпер ацанілі і галасы нашай гісторыі. Увогуле, зразумелая цікавасць валагодцаў і да тэатраў розных краін: міжнародны фестываль у гэтым горадзе адбываўся дзевяты раз.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Элітнае шампанскае «Мінскае»

Мінскі завод пеністых він да 940-годдзя беларускай сталіцы выпусціць новае элітнае шампанскае «Мінскае»

Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі на прадпрыемстве.

Напітак разлічаны на гурманаў. Для яго вытворчасці будуць выкарыстоўвацца высакаякасныя віна-матэрыялы. Вытрымка «Мінскага» складзе каля года.

У калекцыі завода гэта не першае шампанскае прэміум-класа. Цяпер на прадпрыемстве выпускаюць элітнае шампанскае «Радзівіл».

Муз-news

«КРАМБАМБУЛЮ» ПАКАШТАВАЛІ НА КАРПАТАХ

Гурт «Крамбамбуля» нядаўна вярнуўся з Заходняй Украіны, дзе ўдзельнічаў у міжнародным фестывалі «Славське-рок» і прэзентаваў новы альбом. Акрамя беларусаў, на карпацкім фэсце пад адкрытым небам выступалі таксама музыкі з Англіі, Венгрыі, Польшчы і Германіі.

Зрэшты, акрамя музыкі, фэст утрымліваў мастацкую, спартыўную і экалагічную праграмы — але іх «крамбамбульцы», стомленыя начной дарогай, проста праспалі. Затое актыўна паўдзельнічалі ў «інтэграцыйным праекце» пасля выступлення: сабраўшыся ў гатэлі, выканаўцы з розных краін наладзілі сумесны неафіцыйны канцэрт. «Самае смешнае пачалося, калі дайшло да народных песень, — прыгадваюць беларускія артысты, — украінцы спявалі свае, якія, між іншым, у нас лічацца беларускімі. Адрозніваліся толькі канчаткі і асобныя словы. У выніку мы спявалі куплеты па чарзе, кожны на свой узор, далучыліся нават брытанцы!».

У дадатак да музычных адкрыццяў было зроблена яшчэ і моўнае: аказваецца, на захадзе Украіны «бамбуляй» называюць прыгожую дзяўчыну. Так што цяпер у «Крамбамбулі» ёсць новая легенда наконт паходжання назвы гурта.

АТРАКЦЫЁН ШЧОДРАСЦІ Ў ЮРМАЛЕ

На адноўленым конкурсе «Новая хваля», што прайшоў гэтымі днямі ў Юрмале, журы прадэманстравала атракцыён нябачанай шчодрасці, а прадстаўніца Беларусі Паліна Смолава ледзьве не паднялася на прыступку вышэй. Першая прэмія і 50 тысяч доларaў беззагаворачна дасталіся малдаванцы Наталлі Гардзіенка, а з другой прэміяй адбыўся сюрпрыз — «раздваенне». Арганізатары прысудзілі адразу два дуэту з Украіны «Барселона» і латышу Эргліcу. Трэцюю прэмію аддалі польскай спявачцы Марыне.

Паліна Смолава, якая набрала аднолькавую колькасць балаў з казахскім квартэтам «Rin`Go», дзяліла з імі чацвёртае—пятае месца, але... Хлопцы атрымалі адразу два прызы — прыз глядацкіх сімпатый і спецпрэмію Алы Пугачовай (іх таксама было прысуджана дзве, па 50 тысяч — казахскаму бойз-бэнду і Марыне з Польшчы). Так што ў выніковым «табелі аб рангах» казахі падняліся на прыступку вышэй, не прапусціўшы даму наперад. Беларуская спявачка засталася без аніводнай узнагароды — калі не лічыць тры дні бясплатных прамых эфіраў, у тым ліку на расійскім тэлебачанні.

Калі паглядзець фармальна, то занятае Палінай на «Новай хвалі» пятае месца «амаль што» прызавое, і нават вышэйшае, чым у таго ж Дзімы Калдуна на «Еўрабачанні». Аднак 6-ы з 42 і 5-я з 18 — гэта зусім розныя пазіцыі...

Вядучая рубрыкі Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

ХВАРОБА АЛЬЦГЕЙМЕРА,

або Калі чалавек губляе сам сябе

У 1906 годзе нямецкі псіхіятр Альцгеймер апісаў клінічную карціну выяўленай ім спецыфічнай формы старэчай прыдуркаватасці. У ліку яго пацыентаў была жанчына 50 гадоў, якая пакутавала ад прагрэсуючай страты памяці. Доктар прыйшоў да высновы, што яе хвароба не падобная ні на адно апісанае на той момант псіхічнае захворванне. Імя доктара Альцгеймера ўвайшло ва ўсе медыцынскія энцыклапедыі свету, а хвароба была названа яго імем. У гісторыі хваробы той самай пацыенткі захаваліся яе словы: «Я згубіла саму сябе...».

Паводле прагнозаў вучоных, у XXI стагоддзі трэць насельніцтва развітых краін складуць людзі ва ўзросце пасля 60 гадоў. Гэты ўзрост — не старасць, а актыўны перыяд жыцця, калі чалавек ужо дасягнуў устойлівага дабрабыту, вырасціў дзяцей і можа атрымліваць асалоду ад жыцця ў поўнай меры. Аднак менавіта ў гэты час многіх падпільноўвае жахлівая бяспека — хвароба Альцгеймера (у народзе — старэчае бяспамяцтва).

Зараз у свеце налічваецца больш як 10 мільёнаў чалавек, якія пакутуюць ад гэтай немачы. Мяркуецца, што да 2025 года колькасць такіх людзей павялічыцца да 37 мільёнаў. Першыя сімптомы могуць з'явіцца пасля 40 гадоў, а пасля 70-і частата захворвання даходзіць да 30 працэнтаў. Часцей на ўзроставае бяспамяцтва хварэюць жанчыны.

Хвароба Альцгеймера пакуль невылечная. Яна пачынаецца з нязначных парушэнняў памяці і нездольнасці засвойваць новыя рэчы — сімптомаў, якія часам цяжка адрозніць ад простай забыўлівасці і ляноты. Чалавек яшчэ цалкам у стане весці незалежнае існаванне, ён кіруе машынай, ходзіць у магазін і разумна распараджаецца грашыма. Паступова з'яўляюцца ўпадак настрою, апатыя, беспрычынныя слёзы і сум. У далейшым хворыя страчваюць прывычныя навыкі і здольнасць ажыццяўляць самыя простыя дзеянні, перастаюць арыентавацца ў прасторы, іх мова становіцца блытанай і нязвязнай, прападае каардынацыя рухаў, на пэўным этапе яны перастаюць пазнаваць блізкіх, забываюць сваё імя і адрас (прычым забываюцца спачатку бліжэйшыя па часу падзеі, а потым больш аддаленыя). Людзей з бліжэйшага акружэння пачынаюць называць чужымі імёнамі, напрыклад, прадстаўнікоў маладога пакалення — імёнамі сваіх братоў і сясцёр, затым — імёнамі даўно памерлых сваякоў і знаёмых. Урэшце хворыя перастаюць пазнаваць уласнае знешняе аблічча: гледзячы на сябе ў люстэрка, могуць спытаць: «А гэта што за стары?».

Прагрэсуючы, хвароба ў рэшце рэшт прыводзіць да смерці чалавека, якой папярэднічае стадыя практычна «расліннага» існавання — хворы аказваецца не ў стане кантактаваць з навакольнымі, есці і піць. Паміж першай і заключнай стадыямі хваробы мінае ў сярэднім каля 7—8 гадоў. Аднак медыцыне вядомыя выпадкі, калі хворыя памяралі праз 3—4 гады пасля выяўлення першых адзнак захворвання, а некаторыя жылі з гэтай немаччу і ўсе 20.

Даказана, што хвароба Альцгеймера выклікаецца парушэннем правільнага распаду бялкоў у клетцы. Цікава, што ў чалавека з высокім інтэлектам менш шанцаў сутыкнуцца з праявамі гэтай хваробы па той прычыне, што ў яго існуе вялікая колькасць сувязяў паміж нервовымі клеткамі. А значыць пры гібелі адных клетак страчаныя функцыі могуць перадавацца іншым, якія раней не былі задзейнічаны. Высветлілася таксама, што захворванне ніяк не звязана з курэннем, ужываннем алкаголю, чаю, кавы, узроўнем фізічнай нагр

Дарога на Богіна надзіва прыгожая — уздоўж Богінскага возера, якое не бачна за дрэвамі, але прысутнасць якога адчуваецца па асаблівым святле і паветры; сярод лесу, які ўтварае адпаведны настрой: пераход паміж тым, што пакінуў за спінай, і тым, што чакае наперадзе. Пышная жывая заслона да часу хавае ад гледача мэту яго прыходу, а потым раптам адкрывае адначасова вёску і возера па абодва бакі старадаўняй дамбы — вялізнае, выцягнутае, з астравамі, паўастравамі, пясчанымі пляжамі і пакрытымі лесам берагамі. Яго адразу ўсё ўбачыць немагчыма, як немагчыма з берагу здагадацца пра форму — возера паварочвае, хаваецца за плацінай, маніць з-за дрэў, зіхаціць вячэрнім золатам паміж астравамі і ўвесь час пакідае за сабой права на тайну.

Возера Богінскае.

У БОГІНА ЗА ПАЗУХАЙ

Гаспадар сядзібы Уладзімір БАЧЫЛА.

Сяброўкі Дзіна БАЧЫЛА і Аліна КОБЗІК у ролі першых турыстаў.

Мы прыехалі туды ўвечары, стомленыя, бо ўвесь дзень каляcілі па Віцебшчыне, і перанасычаныя інфармацыяй, бо адным махам збіралі матэрыял адразу для некалькіх публікацый. Але тут, яшчэ нават на пад'ездзе, у лясной галерэі, і потым — на раскрытай прасторы, ля вады, усё заклікала адкінуць клопат, забыцца на мітусню і атрымліваць асалоду, няспешна хадзіць, глядзець, дыхаць і адчуваць, што жывеш, а не імчышся з вар'яцкай хуткасцю ў недакладна вызначаным накірунку.

Сядзібу Уладзіміра Бачылы мы знайшлі не адразу, бо нумары на дамах тут, хутчэй, выключэнне з правілаў. Далёка не ўсе яшчэ ведаюць і прозвішча Бачыла, яно не тутэйшае. Затое як толькі мы сказалі, што нам патрэбны дом, які купіў мінчанін, нас адразу накіравалі правільна. Сталічных жыхароў у Богіне становіцца ўсё болей: адны жывуць тут усё лета, некаторыя перабраліся назаўсёды, ажаніліся на богінскіх дзяўчатах, а Уладзімір маецца па некалькі разоў на тыдзень паміж Мінскам і вёскай за 200 кіламетраў, і ўжо не ўяўляе сябе без гэтых дарогі, цішыні і дому.

Ён набыў яго ў лютым 2006 года за 2 тысячы долараў (цяпер, кажа, такіх цэн у Богіне няма). На самай справе месца, дзе стаіць дом, гістарычна — не Богіна, а калісьці суседняе з ім мястэчка Угар, адно з трох на Браслаўшчыне, якое карысталася магдэбургскім правам і мела ўласны герб. У 1792 годзе Угар налічваў 48 дамоў. Але праз некаторы час яно было цалкам знішчана, па адной версіі — уладальнікам гэтых зямель графам Мікалаем Мануцы, венецыянцам і авантурыстам, які вырашыў адпомсціць вольналюбівым местачкоўцам за непаслухмянасць, а па другой — у выніку страшнай эпідэміі. Потым Угар так і не адрадзіўся.

Як і многія гаспадары вясковых сядзіб, Уладзімір Бачыла спачатку не думаў пра занятак турызмам. Неяк выпадкова зайшоў на турыстычную выставу, пабачыў знаёмы ўжо многім стэнд з плятнём, курачкамі, агаркаўскім сырам*, ніжнікаўскімі лялькамі** і... загарэўся. Я ўвесь час думаю, што рухае людзьмі, калі яны вырашаюцца ўтварыць са свайго дома, не важна адзінага, як у Кролаў***, ці другога, як у Бачылы, турбазу. Калі я размаўляю з гаспадарамі сядзіб, то разумею, што прычыны могуць быць розныя. Тыя, што на паверхні. Напрыклад, ранняя пенсія, нізкія заробкі, скарачэнне на працы, жаданне атрымаць дадатковы прыбытак, «ажывіць» пустую хату, прага знаёмстваў і г. д. Але ў глыбіні душы гэтымі людзьмі рухаюць усё ж падобныя сілы: увасабленне дзіцячай мары, вычытанай у трынацаць гадоў у нейкай кніжцы атмасферы прыгод і свята. Пад выглядам прыёму турыстаў яны даюць сабе волю і ажыццяўляюць самыя смелыя фантазіі.

Вось і Уладзімір Бачыла. Як толькі ён ліквідаваў вялізную звалку ля свайго богінскага дома («Адных тэлевізараў там было больш за дзесятак. Металалому два трактары вывез», — кажа гаспадар), адразу стаў думаць, ці не зрабіць у гэтым яры каменныя гроты і пячэры для дзяцей, каб яны маглі там хавацца і гуляць у хобітаў ці Тома Соера. Ці хоць бы гарбаты мосцік да суседа — егера Богінскага лясніцтва Мікалая Мажэйкі, які даўно ўжо, па сутнасці, займаецца вясковым турызмам: дае на сваёй сядзібе прытулак паляўнічым.

Дом Уладзіміра стаіць на ўзвышшы. З таго боку двара, што спускаецца ў яр, гаспадар плануе паставіць драўляную сцэну для бардаўскіх фэстаў — рэльеф тут стварае цудоўную акустыку, а схіл пагорка — зручнае месца для гледачоў. Апаратура для гэтага ўжо ёсць, Уладзімір прафесійна займаецца радыётэхнікай. Наступную ідэю падкінуў старшыня Далёкінскага сельскага Савета Аляксандр Ларчанка. Неяк праязджаў міма, зайшоў, павітаўся, распытаў пра планы і дадаў: «Пляцоўку спартыўную абавязкова зрабі. Валейбольную, ці тэнісны корт». Паабяцаў з тэхнікай дапамагчы. А тут днямі дачка з байдарачнага паходу вярнулася, і сама сабой узнікла задума пракласці водны маршрут з Богінскага возера да, скажам, Дрысвят, альбо возера Рычы, ды, увогуле, напрамак тут можна выбіраць любы і кожны раз новы — гэта ж Браслаўшчына! А там ужо робіцца лагічным і трансгранічны турызм з валютнымі даходамі ў мясцовы бюджэт...

Усё гэта пакуль што планы. Але і зроблена за год з невялікім нямала. Некалькі месяцаў пайшло на ліквідацыю звалкі. Потым Уладзімір абдзіраў драўніна-валакністыя пліты, якімі была знутры абшытая хата. Пакуль паліў іх, са шматлікімі слаямі фарбы, ледзь не атруціўся. Потым балгаркай зачышчаў знутры зруб, апрацоўваў проціпажарным сродкам, уцяпляў і абшываў блокхаўзам звонку. Памочнікаў наймаў у асноўным з мясцовых, але прыходзілася і з Мінска прывозіць. Не толькі таму, што з надыходам паляўнічых работ і павелічэннем мінскіх гаспадароў знайсці свабодныя рукі ў Богіна стала праблемай. Але і цану за свае паслугі мясцовыя будаўнікі апошнім часам просяць вышэй сталічнай. З будаўнікамі ва Уладзіміра выйшаў казус. Ён загадаў надбудаваць другі паверх і з'ехаў у горад, а калі праз некалькі дзён вярнуўся, свой дом не пазнаў — перад ім стаяў не двухпавярховы, а трохпавярховы будынак. «Шкада было месца губляць», — патлумачыў майстар.

Цяпер знутры амаль усё гатова для прыёму гасцей. Кухня і санвузел, вялікая гасцёўня з камінам (па ўласнаму праекту гаспадара) і ляжанкай на печы, з доўгім драўляным сталом, стыльнымі крэсламі, стальнымі ложкамі з артапедычнымі матрацамі, шклопакеты, аўдыёвідэацэнтр — адным словам, густоўнае спалучэнне ў інтэр'еры стылю загараднага дома з атрыбутамі сучаснага чалавека. Гэта першы паверх. Другі і трэці такія ж утульныя, цёплыя і светлыя.

— Засталося толькі размясціць работы жонкі, яна ў мяне майстрыха, і адразу ўсё ажыве, заззяе, — усміхаецца Уладзімір. — Ды і дачка, будучы дызайнер, даволі цікавыя ідэі падкідвае.

З хлява Уладзімір зрабіў цудоўную лазню з парыльняй, душам і вялікай залай адпачынку, у якой так дарэчы бярозавы квас на стале. На гарышчы лазні паклаў духмяныя сяннікі для аматараў экзотыкі. У пакрытым дранкай свірне амаль ужо сабраная невялікая этнаграфічная экспазіцыя: з уласнага гарышча, ды суседка тое-сёе прынесла. Старыя рэчы, яны нібы жывыя, прамоленыя думкамі, адшліфаваныя працоўнымі рукамі — выкінуць іх немагчыма. На вясковай турыстычнай сядзібе яны атрымліваюць жыццё цікавых экспанатаў, якія можна мацаць, разглядаць праз іх час і людзей, і нават спрабаваць прымяніць у справе. У спадчыну ад былых гаспадароў дастаўся Уладзіміру і даволі добры склеп, які ён толькі прыбраў ды абклаў камянямі. Шкадуе толькі, што разабраў лазню пачорнаму, што стаяла на ўскрайку яра, паспяшаўся. Цяпер, амаль усё перарабіўшы, ён усё ж імкнецца захаваць дух, які мела сядзіба ў лепшыя свае часы, які, як аказалася, не выветрыўся, але толькі быў схаваны пад напластаваннем слядоў, што пакінулі тут розныя людзі.

Першым госцем сядзібы «Богіна» стаў мастак Мікалай Хомчык, ён пакінуў гаспадару пейзаж з мясцовымі краявідамі. Але па-сапраўднаму Уладзімір Бачыла яшчэ не адкрыўся. Пакуль што запрашае да сябе сяброў, каб выпрабаваць на іх вынікі сваіх намаганняў. Прыслухоўваецца да іх заўваг і тое-сёе папраўляе. З ландшафтам нямала яшчэ работы засталося. Зараз дарожкі выкладвае, дзіцячую пляцоўку абсталёўвае. Як і астатнія жыхары Богіна, копанку збіраецца зрабіць, каб уласную рыбу заўсёды мець пад рукой. Цалкам магчыма, што хутка сядзіба будзе гатовая для прыёму турыстаў.

Богіна — адно з самых найпрыгажэйшых мясцін Браслаўшчыны. Возера тут празрыстае, ёсць пляжы, дзе цалкам бяспечна купацца з дзецьмі, шмат рыбы, гняздзяцца лебедзі. З багатых на ягады і грыбы лясоў нярэдка на дарогу і на прысядзібныя ўчасткі выходзяць казулі, ласі, дзікі; у запрудах дазваляюць сябе сфатаграфаваць бабры. Пасярод возера на самым вялікім востраве знаходзіцца старажытнае гарадзішча. Людзі кажуць, што яно дало назву вёсцы і возеру, бо на ім было капішча паганскіх багоў.

Уладзімір, як толькі закончыць дом, возьмецца за распрацоўку зялёных маршрутаў вакол вёскі, возера і па Браслаўшчыне. Акрамя непаўторных па сваёй прыгажосці мясцін, зручных пляжаў, тут шмат архітэктурных і гістарычных помнікаў, у Каленкішках — вальер для жывёл, пад Паставамі — страўсіная ферма з уласнай страўняй, у Відзах Лаўчынскіх — сера-вадародная крыніца, якая па лекавых якасцях не саступае трускавецкім водам, у Браславе — музей... Усё гэта недалёка.

Асаблівае задавальненне — ад знаёмства з мясцовымі жыхарамі. Тут жыве незвычайны народ, упэўніўся Уладзімір Бачыла, працавіты, добразычлівы і чулы. І дзелавы, які прывык знаходзіць выйсце з любых абставінаў. Так у перабудовачныя крызісныя часы богінцы зарабляліся сабе на жыццё, і нават купляліся машыны, дзякуючы... яблыневым садам. Пра богінскія яблыкі і зараз, кажуць, памятаюць і пытаюцца на піцерскім рынку. Тут не ведаюць платоў, не трымаюць злых сабак, не маюць патрэбы ў моцных замках. А праз два гады падрасце ў рыбагадавальніку «Чарніцы», што па суседству, вугар, і гэта будзе яшчэ адна нагода прыехаць сюды — па далікатэс.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.
в. Богіна.

---

* *агаркаўскі сыр — знакаміты ласунак, які вырабляецца толькі на сядзібе «Дакудава» ў в. Дакудава Лідскага раёна, гаспадыняй Святланай АГАРКА.*

** *ніжнікаўскія лялькі — аўтарскія анучныя лялькі, якія майструе Ала НІЖНІК, гаспадыня сядзібы «Зарачаны» ў в. Зарачаны Пухавіцкага раёна.*

*** *Крол Аляксандр, Вера і Цімур — гаспадары каларытнай сядзібы «Кролава хата» ў в. Забор'е Расонскага раёна.*

Сёння

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.28	21.03	15.35
Віцебск —	5.12	20.58	15.46
Магілёў —	5.18	20.53	15.35
Гомель —	5.20	20.43	15.23
Гродна —	5.44	21.17	15.33
Брэст —	5.51	21.12	15.21

Месяц

Апошняя квадра 6 жніўня.
Месяц у сузор'і Цяльца.

Імяніны

Пр. *Марыі, Магдаліны, Аляксея, Карнілы, Міхаіла, Фокі;*
К. *Дамініка, Пратаза, Яна.*

Надвор'е на заўтра



...у суседзяў

ВАРШАВА	+22 — +24 °С	МАСКВА	+19 — +21 °С
ВІЛЬНЮС	+24 — +26 °С	РЫГА	+21 — +23 °С
КІЕЎ	+28 — +30 °С	С-ПЕЦЯРБУРГ	+22 — +24 °С

Без ападкаў

Дзве даты

4 жніўня

1947 год – нарадзіўся Мікола Селяшчук, вядомы беларускі мастак у галіне станкавай і кніжнай графікі, жывапісу, экслібрыса. Сярод ягоных работ: "Хроніка аднаго вечара", "Канец сезону туманоў", афармляў кнігі Я. Янішчыц, З. Бядулі, Я. Коласа. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

1693 год – вынайдзена шампанскае. Гэта зрабіў абат Дом Перыньён у выніку шматлікіх вопытаў па селекцыі і змешванню. Для гэтага ён выкарыстоўваў вельмі просты прыём – дадаў ва ўжо гатовае віно крыху дражджэй і цукру, дазволіўшы віну дабрадзіць ужо ў бутэльцы. Гэта нескладаная аперацыя і лягла ў аснову аднаго з самых грандыёзных вынаходніцтваў у гісторыі чалавецтва.

Цытата дня:

«Душа, у якой адсутнічае мудрасць, — мёртвая. Але калі ўзбагаціць яе ведамі, яна ажывае, як закінутая зямля, на якую праліўся дождж».

Абу-аль-Фарадж (1226—1286), сірыйскі пісьменнік, вучоны.

Сардэчна віншую з 50-годдзем ***Алу Пятроўну МАКАКЕНКА*** *з в. Асташына.*

Хай спорыцца любая справа,
Не сустракайся ты з бядой,
І колькі б год ні мінавала,
Душа хай будзе маладой!

Вера, *в. Галынь.*

Наблюдательный совет ОАО «БЭМЗ» извещает акционеров о проведении 20 августа 2007 года в 14 часов внеочередного общего собрания акционеров по адресу:

г. Брест, ул. Московская, 202, клуб ОАО «БЭМЗ».

Повестка дня:

1. *О внесении изменений и дополнений в Устав Общества и их утверждение.*
2. *О распределении и использовании Обществом чистой прибыли и расходов на потребление в 2007 году.*

Регистрация участников собрания с 13 часов 30 минут.

Акционерам при себе иметь удостоверение личности, представителям — доверенность.

Справки по телефонам: 42-16-83, 42-13-65.

Наблюдательный совет ОАО «БЭМЗ».

14 августа 2007 г. состоится повторное собрание акционеров

ОАО «Камволь»

Собрание пройдет по месту расположения Общества: г. Минск, ул. Маяковского, 176, конференц-зал, 4 этаж главного корпуса.

Повестка дня:

1. Об увеличении Уставного фонда ОАО «Камволь».
2. О внесении изменений в Устав ОАО «Камволь».

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Маяковского, 176, комн. 204, тел.: 223-14-20, 2-97.

Регистрация участников собрания с 14.00 до 14.45.

Начало работы собрания — 15.00.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 06.08.2007 г.

Для регистрации при себе иметь паспорт.

Inter-ПОЛ

«СВЯТЫ»-ШАРЛАТАН

Непальская паліцыя арыштавала мясцовага самаабвешчанага «святога», які сцвярджаў, што 22 чэрвеня ў Паўднёвай Азіі пачнецца масіўны землятрус.

Бішвешвор Чадхары за апошні месяц праз сваіх паслядоўнікаў распаўсюдзіў сярод мясцовага насельніцтва некалькі тысяч брашур, у якіх сцвярджалася, што 22 чэрвеня ў Паўднёвай Азіі пачнецца землятрус, які працягнецца да 10 ліпеня і забярэ жыцці 300 тысяч чалавек. Прадказанне «святога» прывяло да панікі сярод большай часткі насельніцтва Непала. Таму пасля таго, як за ўвесь дзень пачатку абвешчанай катастрофы не здарылася нічога, разлаваныя мясцовыя жыхары ўварваліся ў дом Чадхары, збілі яго і запатрабавалі пакараць шарлатана. Паліцыі давялося арыштаваць «святога». Раней Чадхары працаваў будаўніком, але тры гады таму пакінуў гэту працу, пераехаў у Катманду і абвясціў сябе «святым». Ён адрасціў доўгія валасы, пачаў насіць карону і жоўты халат і сцвярджаў, у прыватнасці, што здольны вылечваць хворых людзей з дапамогай тразубца. У Непале вельмі шмат падобнага роду «святых». З-за таго, што ў краіне дрэнная адукацыя і ахова здароўя, насельніцтва вельмі забабоннае, і часта звяртаецца да людзей, падобных на Чадхары, па прароцтвы і розныя лекавыя сродкі.

СВЯДОМЫ ЗЛАЧЫНЦА

У Ізраілі злачынца, які быў адпушчаны памылкова на волю, не супакоіўся, пакуль яго не вярнулі за краты.

19-гадовы Эліав Карэн па рашэнню суда павінен быў чакаць вынясення прысуду ў камеры. Яго абвінавачваюць у рабаўніцтве і вымаганні. Пракуратура вырашыла прыпыніць расследаванне па справе аб рабаўніцтве, і суд прыняў рашэнне вызваліць яго ў рамках гэтай справы. Аднак трымаць злачынцу пад вартай павінны былі ў сувязі з другой справай — аб вымаганні. Турэмшчыкі ж, якія прачыталі толькі першую частку пастановы, адправілі Карэна на волю. Трапіўшы дадому, свядомы злачынца рабіў усе намаганні, каб вярнуцца за краты. Некалькі разоў па тэлефоне ён спрабаваў упэўніць супрацоўнікаў упраўлення турмаў, што яны памыліліся, але тыя яго не слухалі. Толькі пасля таго, як у турме па просьбе бацькоў Карэна правялі дадатковую праверку, яму ўдалося вярнуцца за краты.

ПАЦУКІ ПАЗБАВІЛІ ПАЛІЦЭЙСКІХ ЗАРОБКУ

Індыйская паліцыя заявіла, што не можа спраўляцца з расперазаўшымися пацукамі, якія ўмудрыліся прабрацца ў паліцэйскае сховішча і прагрызці ёмістасці з канфіскаванай алкагольнай прадукцыяй. Цяпер, як кажуць паліцэйскія, п'яныя грызуны ходзяць па вуліцах горада і кусаюць прахожых за ногі.

Пасля правядзення аперацыі паліцэйскія штата Біхар канфіскавалі ў нейкай кампаніі піва і каньяк і змясцілі іх на захаванне ў падвале. Аднак пацукі, ад якіх, як вядома, у Індыі церпяць усе без выключэння, прагрызлі дзіркі ў ёмістасцях і цяпер ласуюцца алкаголем. «Мы ўжо сытыя па горла гэтымі пацукамі і не разумеем, чаму іх раптам пацягнула на спіртное», — гаворыць старшы афіцэр паліцыі Кундан Крышнан. Узрушэнне паліцэйскіх можна зразумець, таму што грызуны практычна пазбаўляюць іх заробку: канфіскаваная прадукцыя звычайна прадаецца з аукцыёна.

Падрыхтаваў Ігар РЫГОРАЎ.

СКАНВОРД

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.



УСМІХНЁМСЯ!

— Генерал, на маю галаву ўпала каробка!
— А што ў ёй?
— Нічога!
— А ў каробцы?

☺

— Дарагі, да чаго ж ты ў мяне падазроны!

— А з табой інакш нельга.

— Можна. Проста не трэба ў кожным мужчыне, які сядзіць у шафе, бачыць майго палюбоўніка.

☺

— Алё, прывітанне, у вас долары ёсць у продажы?
— Так, калі ласка.
— А па якому курсу?
— Па шэсць рублёў.
— ??? Прабачце, гэта банк?
— Не, гэта друкарня.

☺

Суддзя звяртаецца да залы прысутных:

— Цішыня! Папярэджваю, што калі хтосьці яшчэ раз скажа «далоў суддзю», той адправіцца на вуліцу.

Праз некаторы час раздаецца голас: «Далоў суддзю!».

Суддзя:

— Абвінавачваны, вас гэта не датычыцца.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

СКАНВОРД (28 ліпеня). Па гарызанталі: Каганец. Аспект. Рахунак. Санітар. Глеб. Рад. Багна. Опус. Таверна. Воз. Асот. Каўпак. Пашана. Турава. Тар. Лес. Сатыр. Матор. Мірны. Кок. Газа. Чарада. Апалак. Лужа. Глобус. Харанека. **Па вертыкалі:** Штык. Акурак. Львоў. Пралог. Бірка. Вера. Арго. Нарыс. Квас. Арба. Маналог. Ціхан. Луб. Ірга. Кажух. Янот. Каса. Арава. Сыч. Сякера. Лаза. Доза. Статыка. Гуно. Народ. Твар. Калыска.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zviazda.by **E-mail:** info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 34.227. Індэкс 63850. Зак. № 4219. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12